ЖУРФАК САМ ПА САБЕ – АСОБА 13



ЗІМА ПАЧЫНАЕЦЦА З ДАЖДЖУ 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

29 ЛІСТАПАДА 2024 г. ПЯТНІЦА № 233 (30367)

## КОРАТКА

• **Місію наглядальнікаў ад СНД на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь узначаліць генеральны сакратар СНД Сяргей Лебедзеў.**

• Тавараабарот Беларусі і Кыргызстана за студзень — верасень 2024 года вырас на 14,1 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

• **Беларуская ўніверсальная таварная біржа і Індыйская палата міжнароднага бізнесу (Indian Chamber of International Business, ICIB) узгаднілі папярэдні пералік кірункаў супрацоўніцтва па развіцці біржавога гандлю Беларусі і Індыі.**

• У Беларусі наяўныя рэсурсы дамашняй гаспадаркі ў III квартале 2024 года склалі ў сярэднім Br2496,1 у месяц.

• **У Брэсцкай вобласці ў 2025 годзе ў гонар святкавання 80-годдзя Вялікай Перамогі плануюць арганізаваць праект «Сям'я пераможцаў».**



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у саміце Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, які праходзіў у Астане, — сёлета Казахстан старшынствуе ў АДКБ. Усяго ў саміце прынялі ўдзел пяць кіраўнікоў дзяржаў — членаў АДКБ. Акрамя Прэзідэнта Беларусі, гэта прэзідэнты Казахстана, Расіі, Таджыкістана і Кыргызстана.**
**Прэзідэнт Беларусі на саміце выступаў першым. Звычайна лідары АДКБ на такіх мерапрыемствах выступаюць у алфавітным парадку, зыходзячы з першых літар у назвах краін. Аднак прадстаўнікі Арменіі на пасяджэнне не з'явіліся, што, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, «характарызуе бягучую геапалітычную сітуацыю ў рэгіёне і ў нейкай ступені нашу арганізацыю».**

З першых вуснаў

# «ШМАТПАЛЯРНАСЦЬ — ГЭТА ГІСТАРЫЧНАЯ НЕПАЗБЕЖНАСЦЬ»

## Аляксандр Лукашэнка агучыў задачы для фарміравання новай архітэктуры еўразійскай бяспекі

### «Ідзе НАТАфікацыя свету»

«З года ў год мы фіксуем, што абстаноўка ў свеце толькі пагаршаецца. Праблема нават не ў тым, што сістэма стрымлівання, процівагаў, якая забяспечвала міжнародную бяспеку і стратэгічную стабільнасць, адышла ў нябыт. Мы недаравальна доўга разварушваемся, каб стварыць альтэрнатыўныя прававыя механізмы», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён выказаў меркаванне, што такі стан спраў камусьці выгадны, калі нормы і прынцыпы міжнароднага права падмяняюцца нейкімі суб'ектыўнымі і сітуацыйна зменлівымі правіламі, інструментамі ваеннага і інфармацыйнага шантажу.

«На гэтым фоне імкліва набірае абароты гонка ўзбраенняў. Працягвае мілітарызавацца Усходнееўрапейскі рэгіён, асабліва Польшча. Ідзе НАТАфікацыя Еўропы і свету ў цэлым», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён канстатаваў разрастанне ваенных канфліктаў і ачагоў напружанасці ў многіх рэгіёнах свету.

«Чапляючыся за дамінаванне, якое выслізгвае, Захад усё больш размаўляе на мове зброі, заплюшчваючы вочы на пагрозы ядзернага супрацьстаяння, што можа выклікаць знішчэнне ўсёй планеты, — сказаў Прэзідэнт Беларусі. — Сумна, што Захад траціць усе сілы на барацьбу з фальшывымі праблемамі. Прычым гэтыя фальшыўкі яны самі і ствараюць. У той час як у сучасным свеце ёсць вялікае мноства транснацыянальных выклікаў і пагроз, з якімі можна і трэба змагацца».

### Захад не гатовы да дыялогу аб агульных праблемах

У якасці яркага прыкладу Аляксандр Лукашэнка прывёў кліматычны парадак дня, які «заходнія палітыкі даўно ператварылі ў бізнес».

СТАР. 2

## МАРКАЎ ЦЫТАТА ДНЯ



**Марат МАРКАЎ, міністр інфармацыі (на пленарным пасяджэнні X Беларускіх асветніцкіх Калядных чытанняў):**

*«Міністэрства інфармацыі накіравана на далейшае супрацоўніцтва з Беларускай праваслаўнай царквой па захаванні маральных і культурных традыцый беларускага народа, ахове гістарычнай праўды, выхаванні патрыятызму моладзі, любові да роднай зямлі, умацаванні веры ў дабро, мір і справядлівасць як аснову духоўнасці сапраўднага грамадзяніна сваёй Айчыны».*

Будзьце пільныя!

# НА МЕСЦА «СУПРАЦОЎНІКАЎ БАНКАЎ» ПРЫХОДЗІЦЬ ЁЛАЧНЫ ПАДМАН

**Да Новага года застаецца крыху больш за месяц, а ў міліцыю ўжо звяртаюцца жыхары сталіцы, якія пацярпелі ад выкрутаў махляроў. Ілжэпрадпрымальнікі распрацавалі сотні злачынных схем і гатовыя нажывацца на перадсвяточнай мітусні. Кібермахляры пастаянна мяняюць свае схемы. Гэта звязана з актыўнай барацьбой праваахоўных органаў і шырокай інфармацыйнай кампаніяй. Сумы пераводаў складаюць сотні тысяч рублёў. Часам ахвяры прадаюць маёмасць, нават кватэры, набіраюць крэдыты...**

СТАР. 3



Спажывец

# НАВАГОДНІ КАЛЬКУЛЯТАР

## Колькі «заважаць» зімовыя святы?

**Пераднавагоднія тыдні — гарачая пара для прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання. Падрыхтоўку да яе ўнівермагі і гандлёвыя цэнтры, рэстараны і кавярні пачалі яшчэ ў лістападзе. У чаканні перадсвяточнага пакупніцкага ажыятажу ствараюцца запасы харчовых і нехарчовых тавараў у крамах, а прадпрыемствы кандытарскай галіны спяшаюцца задаволіць попыт на салодкія падарункі. Хутка ў сотнях магазінаў краіны з'явяцца спецыялізаваныя навагоднія аддзелы, а на вуліцах разгорнуць гандаль ёлачныя кірмашы.**

СТАР. 4



ISSN 1990 — 763X

24233>

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календыры: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «ШМАТПАЛЯРНАСЦЬ — ГЭТА ГІСТАРЫЧНАЯ НЕПАЗБЕЖНАСЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Модная «Зялёная здзелка» Еўрасаюза — не што іншае, як праект нядобрасумленнай канкурэнцыі, які працуе выключна ў інтарэсах краін Захаду, што стаяць у першым шэрагу адказных за забруджванне атмасферы. Дарэчы, аб гэтым ужо многія гавораць», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на іншыя праблемы. Сярод іх — міжнародны тэрарызм. «Тэрарыстычныя арганізацыі выкарыстоўваюць любую магчымасць, каб нагадаць аб сабе. А краіны Захаду адмаўляюцца ад добрасумленнага супрацоўніцтва з нашай арганізацыяй у барацьбе з гэтым злом», — адзначыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы выказаў занепакоенасць наконт перспектыў бескантрольнага прымянення магчымасцяў штучнага інтэлекту, які ўсё часцей выкарыстоўваюць для планавання і вырашэння ваенных задач. «Маючы здольнасць да саманавучання, гэты інструмент можа загубіць чалавецтва, калі яго выпусціць з-пад кантролю», — адзначыў ён.

У ліку праблемных пытанняў Прэзідэнт згадаў тэматыку інфармацыйнай бяспекі і кіберпагрозы. «З аднаго боку, сучасныя тэхналогіі ствараюць тысячы новых магчымасцяў і перспектыў. З другога, яны спараджаюць мноства рызык і пагроз: фэйкі, дэзынфармацыя, атакі на крытычную інфраструктуру», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён канстатаваў, што гатоўнасць Захаду да дыялогу па гэтых і іншых важных пытаннях не праглядаецца. «Але, як мы ўжо неаднаразова гаварылі, любы крызіс нясе ў сабе новыя магчымасці. І нам грэх гэтымі магчымасцямі не скарыстацца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.



Фота БелТА.

## Ключ да рашэння — у Еўразіі

У сваім выступленні Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што менш як месяц таму Беларусь правяла II Мінскую міжнародную канферэнцыю па еўразійскай бяспецы. «Форум заклікаены прадэманстраваць рэальнае імкненне дзяржаў нашага кантынента мяняць жыццё да лепшага. Шматпалярнасць — гэта гістарычная непазбежнасць», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, прапанаваная Беларуссю ідэя Хартыі разнастайнасці і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі накіравана на фарміраванне справядлівага светапарадку, заснаванага на прынцыпах раўнапраўя, суверэнітэту, непадзельнасці бяспекі і павагі да разнастайнасці шляхоў развіцця.

«Ключ да вырашэння бягучых праблем і стварэння эфектыўных механізмаў забеспячэння бяспекі знаходзіцца ў нашай Еўразіі, з яе тысячагадовым вопытам сумеснага жыцця розных народаў, узаемапранікнення культур і цывілізацый. У новай парадыгме міжнародных адносін АДКБ павінна стаць адной з ваенна-палітычных апор архітэктуры бяспекі Еўразійскага кантынента, якая фарміруецца, задаваць трэнд тэме рэгіянальнай бяспекі», — заявіў беларускі лідар.

Ён зазначыў, што ў АДКБ назапашаны пэўны вопыт і ім неабходна дзяліцца з іншымі міжнароднымі арганізацыямі на прасторы Еўразіі.

## Новыя задачы новай архітэктуры

«Хацеў бы звярнуць увагу на шэраг новых задач, якія нам давядзецца вырашаць пры фарміраванні новай архітэктуры еўразійскай бяспекі і ўмацаванні АДКБ», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён перакананы, што гэтыя крокі будуць не толькі ўмацоўваць бяспеку ў рэгіёне, але і садзейнічаць згуртаванасці дзяржаў — членаў АДКБ, павышэнню іміджу Арганізацыі.

***Па-першае, Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным узмацніць узаемадзеянне міжнародных арганізацый, якія працуюць на еўразійскай прасторы.*** «У сувязі з гэтым прапаную прапрацаваць пытанне аб арганізацыі сустрэчы вышэйшых службовых асоб рэгіянальных арганізацый АСЕАН, АДКБ, ШАС, СНД, НУМДА, Савета супрацоўніцтва краін Персідскага заліва», — сказаў ён.

Прэзідэнт адзначыў, што ўжо ёсць апрабаваны механізм рэгулярных сустрэч кіраўніцтва АДКБ, СНД і ШАС. «Чаму не паспрабаваць пашырыць гэты фармат з мэтай абмену ўнікальным міжрэгіянальным досведам? Гатовы гэту сустрэчу правесці ў Беларусі пры вашай згодзе», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Там жа мы маглі б абмеркаваць пытанні актывізацыі супрацоўніцтва АДКБ і ШАС па праблематыцы міжнароднай бяспекі ў рэчышчы рашэння СКБ (Савета калектыўнай бяспекі. — **«Зв.»**) па развіцці супрацоўніцтва АДКБ з СНД і ШАС. Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва мае шырокі парадак дня па пытаннях забеспячэння бяспекі на еўразійскай прасторы, і гэты патэнцыял магчыма выкарыстоўваць», — дадаў Прэзідэнт.

***Па-другое, у рамках АДКБ, лічыць Прэзідэнт, наспела неабходнасць сур'ёзна заняцца пытаннямі штучнага інтэлекту і паглыбіць супрацоўніцтва ў сферы інфармацыйнай бяспекі.*** «Ідэя не новая. Аднак практычныя крокі ў рамках Арганізацыі мы пакуль не пачалі. У той час як краіны Захаду ўжо на ўсю моц займаюцца гэтай праблемай, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба таксама падумаць над тым, як павысіць практычную аддачу ад Пагаднення 2017 года аб супрацоўніцтве дзяржаў — членаў АДКБ у галіне забеспячэння інфармацыйнай бяспекі. Мы павінны ісці ў нагу з імклівым развіццём кібертэхналогій, каб эфектыўна рэагаваць на выклікі і пагрозы бяспекі нашых краін у гэтай сферы».

***Трэцяя задача датычыцца забеспячэння рэжыму кантролю за новымі тыпамі зброі, якія з'яўляюцца.*** «У нас на парозе стаяць новыя смяротныя тыпы зброі, здольныя знішчыць усё чалавецтва. Гэты арсенал папоўніў ужо лазерныя, гіпергукавыя, квантавыя, электрамагнітныя і іншыя перадавыя распрацоўкі», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

«На нашу думку, АДКБ можа і павінна стаць у авангардзе дзейнасці па стварэнні агульнага дагаворна-прававога механізму, які дае магчымасць у будучыні забяспечыць рэжым кантролю за такім узбраеннем. Гэта трэба рабіць ужо цяпер. Прынамсі, пачынаць», — выступіў з ініцыятывай Аляксандр Лукашэнка.

## ❍ Лідары краін АДКБ па выніках саміту ў Астане прынялі дэкларацыю і падпісалі больш за дзясятак дакументаў

На падпісанне кіраўнікам дзяржаў было ўнесена 14 дакументаў. «Усе пытанні прайшлі неабходныя працэдуры ўзгаднення, разгледжаны, адобраны ў ходзе пасяджэння статутных органаў АДКБ», — праінфармаваў удзельнікаў саміту Генеральны сакратар АДКБ Імангалі Тасмагамбетаў.

Асаблівае месца ў пераліку дакументаў займае Дэкларацыя Савета калектыўнай бяспекі АДКБ, якая падрыхтавана з улікам дынамічнага развіцця міжнароднай ваенна-палітычнай абстаноўкі. «У дэкларацыі выказана пазіцыя арганізацыі па актуальных праблемах міжнароднай бяспекі з улікам асноўных прынцыпаў дзейнасці арганізацыі, адлюстраваны асноўныя падыходы дзяржаў — членаў арганізацыі да міжнароднага ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва, накіраваных на ўмацаванне глабальнай і рэгіянальнай бяспекі», — сказаў Генеральны сакратар.

Лідары краін прынялі заяву СКБ АДКБ у сувязі з 80-й гадавінай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і рашэнне аб плане мерапрыемстваў па святкаванні.

У мэтах далейшага развіцця сістэмы калектыўнай бяспекі кіраўнікі дзяржаў — членаў АДКБ прынялі шэраг рашэнняў, накіраваных на далейшае ўмацаванне саюзніцкіх сувязяў, нарошчванне знешнепалітычнай каардынацыі і аснашчэнне Калектыўных сіл Арганізацыі. У выкананне раней прынятага рашэння СКБ АДКБ «Аб аказанні дапамогі Рэспубліцы Таджыкістан па ўмацаванні таджыкска-афганскай граніцы» была зацверджана Мэтавая міждзяржаўная праграма АДКБ па ўмацаванні таджыкска-афганскай граніцы, рэалізацыя якой прадугледжваецца ў 2025—2030 гадах.

Была дадзена высокая ацэнка дзейнасці казахстанскага боку ў перыяд яго старшынства ў АДКБ. Прынята рашэнне аб пераходзе старшынства ад Рэспублікі Казахстан да Кыргызскай Рэспублікі з 1 студзеня 2025 года, у сувязі з чым прэзідэнт Кыргызстана Садыр Жапараў прадставіў прыярытэты на перыяд старшынства.

Чарговая сесія СКБ АДКБ адбудзецца ў чацвёртым квартале 2025 года ў Бішкеку.

## ❍ На палях саміту АДКБ Аляксандр Лукашэнка паразмаўляў з журналістамі

Кіраўніка дзяржавы спыталі, ці павінна астудзіць дэманстрацыя магчымасцяў расійскага ракетнага комплексу «Арэшнік» тых, хто давёў і паставіў свет на мяжу трэцяй сусветнай вайны.

«Дык ужо астудзіла. Гэта ж мы адразу бачым па заявах у СМІ. Праўда, ужо няма адзінай лініі, усё пайшло ўразнабой. Гэта сведчыць аб тым, што крыху разгубіліся, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Але зброя добрая. Не ядзерная зброя, а па сваёй моцы супастаўная з ядзернай зброяй. Аднак без пранікальнай радыяцыі, без заражэння мясцовасці і аб'ектаў».

«Такое моцнае ўздзеянне на так званую сусветную супольнасць і асабліва тых, хто думаў, што ўсё абыдзецца. Не абыдзецца», — падкрэсліў беларускі лідар.

Адказваючы на ўдакладняльнае пытанне, наколькі гэта важна для бяспекі Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнт сказаў: «Натуральна. А тут старэйшаму брату (гаворка пра Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна. — **«Зв.»**) пажартаваў, кажу: «Месцы гатовы для дыслакацыі. Калі?» — «Падумаем» (адказаў Уладзімір Пуцін. — **«Зв.»**)».

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Падчас маштабнай аперацыі Інтэрпола затрымалі 5,5 тысячы кіберзлачынцаў



Маштабная аперацыя Інтэрпола, у якой узялі ўдзел праваахоўныя органы з 40 краін свету, прывяла да затрымання рэкорднай колькасці падазраваных у кіберзлачынствах. Пра гэта гаворыцца ў заяве, апублікаванай на старонцы ведамства, паведаміла ТАСС. Адзначаецца, што падчас аперацыі, якая доўжылася з ліпеня да лістапада, праваахоўнікам таксама ўдалося выключыць больш за $400 млн украдзеных сродкаў у розных валютах і віртуальных актывах. У Інтэрполе ўдакладнілі, што аперацыя была накіравана на барацьбу з сямю тыпамі кіберзлачынстваў, сярод якіх — тэлефонныя махлярствы, аферы ў сферы анлайн-знаёмстваў, арганізацыя нелегальных азартных гульняў у інтэрнэце. Падкрэсліваецца, што ў выніку аперацыі ўладам Паўднёвай Карэі разам з кітайскімі праваахоўнымі органамі ўдалося раскрыць злачынны сіндыкат, у выніку дзеянняў якога пацярпела больш чым 1,9 тысячы чалавек і было выкрадзена каля $1,1 млрд. «Наступствы кіберзлачынстваў могуць быць разбуральнымі — людзі губляюць свае зберажэнні, бізнес не можа працягваць работу, а давер да лічбавых і фінансавых сістэм аказваецца падарваным», — адзначыў генеральны сакратар Інтэрпола Вальдэс Уркіза. Паводле яго слоў, трансгранічны характар кіберзлачыннасці падкрэслівае важнасць міжнароднага супрацоўніцтва праваахоўных органаў.

## У Сеуле наймацнейшыя за больш чым стагоддзе снегапады

Сталіца Паўднёвай Карэі пацярпела ад наймацнейшых за ўсю гісторыю назіранняў снегападаў, якія стварылі небяспечныя ўмовы. Пра гэта паведаміла The Guardian. Адменены дзясяткі рэйсаў, прыпынены паромныя зносіны, паступіла інфармацыя аб гібелі як мінімум чатырох чалавек. Снегапад 28 лістапада стаў трэцім па сіле ў Сеуле з моманту пачатку вядзення запісаў у 1907 годзе, паведаміла інфармацыйнае агенцтва Yonhap са спасылкай на гарадскія даныя. У некаторых раёнах Сеула выпала звыш 40 см снегу, з-за чаго прыйшлося адмяніць больш чым 140 рэйсаў. Незвычайна моцныя лістападаўскія снегапады былі абумоўлены больш высокай, чым звычайна, тэмпературай марскіх вод на захад ад Карэйскага паўвострава, куды пасля ўварваліся патокі халоднага паветра.

## TikTok забароніць падлеткам выкарыстоўваць б'юці-фільтры



Сацыяльная сетка TikTok хутчэй часам забароніць карыстальнікам, якія не дасягнулі 18 гадоў, выкарыстоўваць б'юці-фільтры з-за апасенняў уплыву тэхналогій па «паляпшэнні знешнасці» на псіхічнае здароўе падлеткаў. Аб гэтым паведаміла РІА «Новости». У прыватнасці, будзе забаронена штучна павялічваць вочы, вусны, згладжваць скуру або змяняць яе тон. Адзначаецца, што сацсетка аб'явіла аб змяненнях на форуме па бяспецы ў сваёй еўрапейскай штаб-кватэры ў Дубліне. Апошнім часам сярод грамадскасці растуць апасенні аб уплыве фільтраў, што «паляпшаюць знешнасць», на псіхічнае здароўе і самаацэнку дзяцей, асабліва дзяўчынак. Некаторыя маладыя людзі пасля выкарыстання фільтраў пачынаюць лічыць свой сапраўдны твар пачварным.

Дзяржаўны інтарэс

# КАНКУРЫРАВАЦЬ МОЖНА ТОЛЬКІ ЯКАСЦЮ

## Наталля КАЧАНАВА наведала сталічнае ААТ «Галантэя»

**Сустрэча атрымалася не толькі рабочая, а і святочная. Прадпрыемства ў гэты дзень адзначыла 100-гадовы юбілей. Старшыня Савета Рэспублікі павіншавала калектыў і кіраўніцтва прадпрыемства са святам, а таксама ацаніла прадукцыю, якая выпускаецца, і паразмаўляла з калектывам. Карэспандэнты «Звязды» далучыліся да юбілейнага мерапрыемства.**

Віншуючы калектыў з юбілеем, Наталля Качанава адзначыла, што за стагоддзе прадпрыемства прайшло сур'ёзныя этапы ў сваім станаўленні, дасягнула добрых вынікаў і сёння выпускае выдатную прадукцыю, якая запатрабавана не толькі на рынку нашай краіны, але і далёка за яе межамі. «Мы заўсёды з вялікай радасцю купляем тое, што вы выпрабляеце, — сумачкі, скургалантарэйныя вырабы, таму што гэта не толькі высокая якасць, але яшчэ і даступны кошт і прыгожы дызайн. Кожны раз вы абнаўляеце асартымент — і гэта выдатна!» — сказала спікер, дадаўшы, што «Галантэя» працуе на эканоміку не толькі горада Мінска, але і нашай краіны ў цэлым. Наталля Качанава таксама пажадала, каб прадпрыемства прырастала новымі ідэямі, праектамі і кадрамі.



Фота Лізаветы ГОЛАД

Па словах Наталлі Качанавай, канкурэнцыя на ўсіх рынках, і асабліва лёгкай прамысловасці, сёння даволі сур'ёзная, таму заваяваць свайго спажыўца, пакупніка вельмі важна. Дзяржава падтрымлівае айчынных вытворцаў, а вытворцам трэба разумець, што прадукцыя павінна быць якаснай. «Гэта задача, якую ставіць Прэзідэнт, урад, — заўважыла спікер. — І мы заўсёды вельмі сур'ёзна ставімся да таго асартыментнага пераліку, які ёсць у нашых крамах, разумеючы, што пры рабоце прадпрыемстваў людзі павінны зарабляць годную зарплату і выпускаць тую прадукцыю, якая будзе запатрабавана не толькі ўнутры нашай краіны, але і далёка за яе межамі».

Гаворачы пра вынікі года, Наталля Качанава заўважыла, што ў сталіцы ўдалося зрабіць многае. Выкананы прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця, будуецца жыллё, паляпшаецца інфраструктура. У найбліжэйшы час будзе адкрыта тры станцыі метро, горад цалкам будзе пераведзены на водазабеспячэнне з падземных крыніц... «Важна, што ўсе гэтыя праграмы і праекты — рэальныя, яны рэалізоўваюцца ва ўстаноўленыя тэрміны і нават з апярэджаннем і, безумоўна, сёння патрэбныя жыхарам сталіцы», — сказала Старшыня Савета Рэспублікі.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# НА МЕСЦА «СУПРАЦОЎНІКАЎ БАНКАЎ» ПРЫХОДЗІЦЬ ЁЛАЧНЫ ПАДМАН

### Інфармацыю са сваёй карты людзі ўжо не даюць. Амаль не даюць

Як адзначыў **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці Міністэрства ўнутраных спраў Аляксандр РЫНГЕВІЧ,** у параўнанні з мінулым годам удвая знізіліся выпадкі дыстанцыйнага крадзяжу грошай з банкаўскіх плацежных картак грамадзян. Калі раней пад рознымі падставамі злачынцы выманьвалі доступ да інтэрнэт-банкінгу або звесткі аб плацёжнай картцы, то цяпер спецыялісты фіксуюць планамерны адыход ад такога спосабу. «Аднак такіх дыстанцыйных крадзяжоў яшчэ досыць шмат», — адзначае Аляксандр Рынгевіч.

Пры гэтым узрасла колькасць іншых ашуканскіх дзеянняў. Злачынцы схіляюць грамадзян самастойна пераводзіць аплату за ўяўныя тавары і паслугі, якія рэкламуюцца ў сацыяльных сетках. На гэты від махлярства прыпадае 40 % злачынстваў. Назіраецца сезоннасць. Так, у канцы лета гэта прапановы па здачы кватэр, цяпер — продаж шын і навагодніх падарункаў.

10 % злачынстваў звязана з прапановай інвеставаць у прадпрыемствы, крыптавалюту, у рынкі, якія развіваюцца. Выкарыстоўваецца інфармацыя аб сапраўды існуючых дзяржаўных арганізацыях, знакамітых персонах. Яны ніякага дачынення да інвеставання не маюць, выкарыстоўваюць іх імя і знешні вобраз для таго, каб схіліць чалавека на свой бок. Такія лжэінвестыцыі могуць складаць значныя памеры. Спачатку прапануецца ўкласці нязначную суму, але з часам яна значна вырастае пад той ці іншай падставай. Грамадзяне досыць доўга не звяртаюцца ў праваахоўныя органы, што абцяжарвае выратаванне ўкладзеных сродкаў.



Як распавёў прадстаўнік МУС, зламыснікі збіраюць адкрытую інфармацыю аб тым ці іншым кіраўніку арганізацыі, потым ад яго імя рассылаюць інфармацыю аб нейкай спецаперацыі, звязанай з грашыма. Калі раней ад гэтай схемы пакутавалі буйныя калектывы медыкаў, настаўнікаў, то цяпер спецыялісты фіксуюць кропкавыя факты, калі зламыснікі атрымліваюць інфармацыю аб некалькіх падначаленых, спецыяльна ствараюць рахунак на месенджар. Аляксандр Рынгевіч параіў абавязкова пераправяраць інфармацыю,ператэлефанаваць кіраўніку.

### Аферысты ўзяліся за старое

Схемы завалодання грашыма грамадзян у аферыстаў розныя. Пра найбольш распаўсюджаныя ў сталіцы распавёў **начальнік упраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці ГУУС Мінгарвыканкама Дзмітрый СТАСЮЛЕВІЧ,** таксама ён даў слушныя парады, як не трапіцца на хітрыкі махляроў.

У сталічную міліцыю паступаюць паведамленні граджан, у якіх кібермахляры выкралі грошы на падставе продажу навагодніх ёлак. Так, адна з заяўніц убачыла ў сацыяльнай сетцы рэкламу аб продажы навагодніх штучных дрэў і звязалася з «прадаўцом». У якасці перадаплаты менеджар папрасіў пералічыць яму 350 рублёў, а пасля атрымання грошай перастаў выходзіць на сувязь.

Па такім жа сцэнарый ашуканцы падманулі і іншых пацярпелых. «Для таго каб не стаць чарговай ахвярай «ёлачных аферыстаў», не варта згаджацца на падазроныя анлайн-прапановы аб куплі тавараў па занадта нізкай цане, а таксама нельга пералічваць грошы да атрымання тавару», — нагадаў Дзмітрый Стасюлевіч.

Таксама ў мінскую міліцыю звяртаюцца гараджане, якіх пад выглядам прадстаўнікоў службы дастаўкі «Белпошты» падманулі кіберзлачынцы. Ва ўсіх выпадках аферысты выкарыстоўваюць тую ж схему. У месенджарах людзям прыходзіць паведамленне нібыта ад паштовай арганізацыі, у якім паведамляецца пра паступленне пасылкі. Там жа паказана, што атрымаць бандэроль нельга з-за адсутнасці або недакладнай інфармацыі аб адрасе атрымальніка. Грамадзяніну прапануецца прайсці па спасылцы, замацаванай у паведамленні, дзе неабходна ўвесці адрасныя даныя і аплаціць паўторную адпраўку пасылкі. Атрымальнік пераходзіць па спасылцы і трапляе на фішынгавы сайт, дзе пасля ўводу асабістых даных пазбаўляецца сродкаў на карце.

Адзін з пацярпелых пасля атрымання такога паведамлення перайшоў па фішынгавай спасылцы і ўвёў рэквізіты банкаўскай карты, пасля чаго з яе спісалі каля 400 рублёў. Устаноўлена, што гэтымі сродкамі былі аплачаны тавары на замежных сайтах: адзенне, абутак, прадметы асабістай гігіены.

Каб не трапіцца на хітрыкі «паштовых аферыстаў» і захаваць свае грошы, неабходна праяўляць пільнасць і прытрымлівацца наступных рэкамендацый, папярэдзілі ў міліцыі:

— уважліва вывучайце нумары адпраўнікоў падобных паведамленняў (як правіла, гэта замежныя нумары);

— для ўдакладнення інфармацыі пра паступленне пасылкі звярніцеся ў найбліжэйшае паштовае аддзяленне;

— самастойна правервце статус бандэролі і яе рух можна на афіцыйным сайце «Белпошты»;

— ні ў якім разе не пераходзьце па спасылках, прымацаваных да паведамленняў.

### Паўдзельнічай у «акцыі» і атрымай «падарунак»

Некалькі апошніх гадоў фіксуюцца выпадкі падману аферыстамі нашых людзей ад імя банкаў. Схема наступная: у сацыяльнай сетцы мінчане знаходзілі паведамленне ад банка з прапановай паўдзельнічаць у навагодняй акцыі і атрымаць у падарунак 150 рублёў. Пацярпелыя пераходзілі па спасылцы, названай у «сторыс», на нібыта афіцыйную старонку банка, дзе ўводзілі лагін і пароль, а праз час выяўлялі спісанне грошай са сваіх рахункаў.

«У гэтым выпадку мінчане сталі ахвярамі фішынгу — аднаго з самых распаўсюджаных відаў кіберзлачынстваў, — распавёў начальнік упраўлення Мінгарвыканкама. — Пацярпелыя перайшлі па фішынгавай (падробленай) спасылцы на сайт, які па афармленні і дызайне сапраўды быў падобны на афіцыйны сайт банка, але разам з тым меў некаторыя адрозненні, аднак на іх гараджане ўвагу не звярнулі.

Дзмітрый Стасюлевіч нагадаў, што пры здзяйсненні плацежных аперацый у інтэрнэце неабходна правяраць карэктнасць адрасоў сайтаў. Пераходзіць у «Інтэрнэт-банк» варта толькі з афіцыйнай старонкі сайта банка і пажадана захоўваць афіцыйную спасылку для ўваходу ў асабісты кабінет на галоўнай старонцы браўзера.

### Каб Новы год за горадам атрымаўся

Напярэдадні Новага года фіксуюцца махлярствы з пасутачнай здачай жылля, асабліва загарадных дамоў. Мінчане хочуць святкаваць шумна і вялікай кампаніяй, таму загарадныя дамы на суткі карыстаюцца папулярнасцю. У апошнія гады было дастаткова зваротаў мінчан, якія на анлайн-пляцоўках знаходзілі ўпадабаны дом або кватэру, пасля чаго спісваліся з арэндадаўцамі. Тыя, у сваю чаргу, прасілі ўнесці перадаплату або заплаціць цалкам, аднак пасля пераводу грошай переставалі выходзіць на сувязь. Таксама «арэндадаўцы» выдалялі аб'явы і перапіску ў месенджарах.

Каб не трапіцца на хітрыкі махляроў пры арэндзе жылля, Дзмітрый Стасюлевіч параіў заўсёды правяраць дакументы на кватэру, а таксама прасіць уласніка паказаць пашпарт. Не варта ўносіць грошы без заключэння дагавора арэнды. У ім неабходна прапісваць перадачу авансавага плацяжу, умовы яго вяртання. Таксама неабходна браць распіску аб выплаце авансу. І самае галоўнае — асабіста агледзець жыллё. Часта прыгожыя карцінкі могуць быць узяты з інтэрнэту.

### Вымагальніцтва пасля блакіравання

**Намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі расследавання кіберзлачынстваў і лічбавага развіцця галоўнага ўпраўлення лічбавага развіцця папярэдняга следства цэнтральнага апарату Следчага камітэта Леанід МЕЛЬНІК** паведаміў, што ашуканцы могуць здзяйсняць адначасова некалькі злачынстваў, як махлярства, так і мадыфікацыю інфармацыі.

«Найбольш распаўсюджаная схема — вымагальніцтва пасля блакіравання ўліковага запісу ў сацыяльнай сетцы або мабільнага тэлефона. У месенджарах размяшчаецца просьба прагаласаваць за тую ці іншую асобу, перайшоўшы па спасылцы, а потым блакіруюцца ўліковыя запісы і ідзе вымагальніцтва для разблакіроўкі.

Таксама, адзначыў Леанід Мельнік, ашуканцы ствараюць інтэрнэт-старонкі ў сацыяльных сетках, называюць іх падобнымі на рэальна існуючыя інтэрнэт-крамы, размяшчаюць фатаграфіі тавараў і станоўчыя водгукі пакупнікоў. Спажыўцы павінны разумець: калі цана намнога ніжэйшая за рынкавую і інфармацыя размешчана ў месенджарах або сацсетках, гэта павінна выклікаць падазрэнне, пераправерку. Не трэба спяшацца аддаваць грошы за тавар, рабіць перадаплату, а потым шкадаваць, што вас падманулі, таму што перасталі выходзіць на сувязь.

Кіберзлачыннасць пастаянна змяняецца, хутка адаптуецца да мер стрымлівання і папярэджання з боку праваахоўных органаў, часта злачынцы знаходзяцца за межамі Беларусі, што выклікае пэўную складанасць пры расследаванні злачынстваў. Аднак спецыялісты бачаць, у якім кірунку рухацца, якія меры неабходна прымаць. Грамадзянам трэба ўважліва выконваць правілы лічбавай гігіены, не паддавацца на хітрыкі сацыяльнай інжынерыі, якімі карыстаюцца ашуканцы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# НАВАГОДНІ КАЛЬКУЛЯТАР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Для якаснага абслугоўвання насельніцтва ў перадсвяточныя і святочныя дні Новага года і Раства сёння праводзіцца актыўная работа па падрыхтоўцы аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання да зімовых свят, — расказала **начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Наталля МЕЛЬНІКАВА.** — У рэгіёнах краіны зацверджаны планы мерапрыемстваў па гандлёвым і бытавым абслугоўванні насельніцтва ў перадсвяточныя дні. Забяспечваецца шырокі асартымент тавараў, у тым ліку запатрабаваных менавіта ў гэты перыяд. А работа па тэматычным афармленні вітрын і фасадаў, гандлёвых і абедзенных залаў, прылеглых тэрыторый праводзіцца яшчэ з сярэдзіны лістапада і завершыцца ў першай дэкадзе снежня.

## Кірмашы, распродажы, дэгустацыі

Больш за 250 гандлёвых аб'ектаў і звыш 280 аб'ектаў грамадскага харчавання па ўсёй краіне падоўжаць рэжым работы ў перадсвяточныя і святочныя дні. Ужо сёння ва ўстановах грамадскага харчавання арганізаваны прыём папярэдніх заказаў і распрацаваны святочныя меню, расказала Наталля Мельнікава. Кавярні, рэстараны і сталовыя зараз прымаюць заказы на абслугоўванне навагодніх і калядных «аганькоў» і карпаратываў, іншых навагодніх мерапрыемстваў, дадала яна. Кошт такіх мерапрыемстваў для аднаго чалавека сёлета (пакуль непасрэдна навагодняя ноч яшчэ не наступіла) вар'іруецца ад 50 да 330 рублёў — усё залежыць ад установы і фармату свята. У саму навагоднюю ноч кошт, зразумела, можа быць вышэй.

— Ва ўсіх рэгіёнах і Мінску праводзіцца падрыхтоўка да перадсвяточных калядных і навагодніх кірмашоў, — сказала прадстаўнік МАРГ. — Такіх запланавана 350. Галоўны атрыбут Новага года — ёлка — з'явіцца ў продажы прыкладна з 18 снежня. Гандаль ёлкамі пачнецца ў Брэсцкай вобласці, а потым і ва ўсіх астатніх рэгіёнах. Усяго па краіне запланавана правядзенне 590 ёлачных кірмашоў.

Агучыла спецыяліст і чаканыя цэны на ёлкі. Што да елак натуральных, прыкладныя рознічныя цэны складуць ад пяці рублёў (за дрэва да 50 см) да 23 рублёў (за навагоднюю ёлку да 3 м). Жывая елка да метра будзе каштаваць каля 13 рублёў, да двух метраў — 16. Жадаеце «экалагічную» елку ў кадцы — прыйдзецца растаца з сумай каля 28 рублёў. А кошты на ёлачныя букеты будуць пачынацца ад чатырох рублёў.

— Пакупнікам прапануюць больш за 100 найменняў штучных ёлак і соснаў, з іх звыш 40 відаў — айчыннай вытворчасці па цэнах ад шасці рублёў і вышэй, — адзначыла Наталля Мельнікава.

Парадак цэн на штучныя ёлкі, паводле яе слоў, такі: ад шасці рублёў будзе каштаваць ёлка да метра, але максімальны кошт такога дрэўца можа даходзіць і да 200 рублёў. А калі штучная ёлка высокая (парадку 5 м), то немалой будзе і яе цана: можа складаць некалькі сотняў рублёў. У асартыменце ў навагодніх аддзелах будуць і карнавальныя навагоднія касцюмы, цэны на іх складуць ад 11 да 380 рублёў.



Зразумела, ёлку трэба ўпрыгожыць, і да Новага года, напэўна, захочацца да старых ёлачных цацак дадаць новыя. Наталля Мельнікава падкрэсліла, што святочны асартымент сёлета шырокі і разнастайны. Толькі навагодняй атрыбутыкі на паліцах магазінаў будзе прапаноўвацца больш чым 20 тысяч найменняў, у тым ліку каля дзвюх тысяч пазіцый ёлачных упрыгожванняў, сувеніраў, сфарміраваных падарункаў.

Дарэчы, пра салодкія падарункі — адзін з сімвалаў Новага года. Сярэднія цэны на іх складуць ад 9,5 да 100 рублёў. А шампанскае, не менш важны атрыбут навагодняй ночы, абыдзецца пакупніку ў суму ад васьмі да 20 рублёў.

І аб падарунках родным і блізкім. Іх можна будзе знайсці на навагодніх распродажах і па святочных акцыях — такіх мерапрыемстваў па краіне адбудзецца каля 13 тысяч, або на 2,5 тысячы больш, чым у мінулым годзе.

— Запланавана больш як 10 тысяч святочных распродажаў, 1,5 тысячы рэкламных акцый, 330 дэгустацый прадукцыі, больш за 70 рэкламных гульняў, — праанансавала Наталля Мельнікава. — Акрамя таго, сёлета па ўсёй краіне пройдзе вялікая навагодняя акцыя, якая закране значную колькасць тавараў: адзенне, абутак, кандытарскія вырабы, сокі, мэблю, сінтэтычныя мыйныя сродкі і многае іншае. Таксама ў снежні пройдзе акцыя па пашыраным продажы беларускай касметыкі і сродкаў бытавой хіміі. Зніжкі могуць даходзіць да 60 %.

## Куды пайсці за ёлкай?

У сталіцы і Мінскай вобласці гандаль і грамадскае харчаванне таксама актыўна рыхтуюцца да зімовых свят.

— Трэба стварыць навагоднюю атмасферу і ўзняць настрой як мінчанам, так і гасцям сталіцы, — падкрэсліла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Ірына МАСЛАКОВА.**

У сталіцы ўжо праходзяць навагоднія мерапрыемствы для школьнікаў і дашкольнікаў, упрыгожваюць вітрыны, ва ўнівермагах і магазінах можна знайсці карнавальныя касцюмы, падаўжаюцца рэжымы работы кавярняў і рэстаранаў, якія рыхтуюцца да перыяду навагодніх карпаратываў. Мінчан перад Новым годам і Калядамі гандаль пацешыць шматлікімі акцыямі, распродажамі і зніжкамі, расказала прадстаўнік Мінгарвыканкама.

— Што датычыцца галоўнага атрыбута свята — ёлкі — у Мінску будзе звыш 60 аб'ектаў па яе рэалізацыі, яны пачнуць работу з 22 снежня, — праінфармавала яна.

Навагоднія кірмашы пройдуць ва ўсіх раёнах сталіцы. Галоўнай сёлета застанецца пляцоўка каля Палаца спорту, але будуць і новыя лакацыі, напрыклад, каля Нацыянальнай бібліятэкі.

— У Мінскай вобласці навагоднія кірмашы стартуюць з 14 снежня і будуць праходзіць кожныя выхадныя, — адзначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінскага аблвыканкама Наталля СУЙКОВА.** — Найбуйнейшыя ў вобласці адбудуцца 21 снежня ў Барысаве, Вілейцы, Маладзечне, 22 снежня — у Нясвіжы і Слуцку, 28 снежня — у Жодзіне і Салігорску. Усяго святочных кірмашоў у Мінскай вобласці запланавана каля 80, а таксама больш за 100 ёлачных, якія, у сваю чаргу, стартуюць 21 снежня. Распродажы і навагоднія акцыі ў аб'ектах гандлю сталічнай вобласці пачнуцца ўжо 1 снежня, усяго іх запланавана каля 500.

## Росту цэн не чакаецца

Традыцыйныя кулінарныя сімвалы зімовых свят — шакаладныя цукеркі, мандарыны і чырвоная ікра. У Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю адзначаюць, што росту цэн на гэтыя пазіцыі перад Новым годам не чакаецца.

— Кандытарскія вырабы трапляюць пад дзеянне пастановы ўрада аб цэнавым рэгуляванні, на іх распаўсюджваецца пэўная гандлёвая надбаўка, — падкрэсліла **начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання МАРГ Наталля МЕЛЬНІКАВА.** — Гэта значыць, што гандаль не мае права падымаць цану вышэй, чым гэта ўстаноўлена пастановай № 713. Аналіз цэн на навагоднія падарункі ў параўнанні з мінулым годам паказаў, што змяненні фактычна менш чым на рубель. Нават не на ўсе навагоднія падарункі ўстаноўлена максімальная гандлёвая надбаўка. З цукеркамі тое ж самае. Цяпер навагодні перыяд, МАРГ маніторыць цэнаўтварэнне, парушэнняў тут практычна няма. Калі і ідзе павышэнне цэн, то з-за росту кошту какава-бабоў, але гэта нязначнае павышэнне.

Цэны на мандарыны таксама не чакаюцца вышэй, чым у мінулы перадавагодні і навагодні перыяды, адзначыла спецыяліст.

— Падаражэння мы не чакаем. Улічваючы, што ў нас будуць пашыраныя акцыі, распродажы, росту цэн не толькі на мандарыны, але і на іншыя прадукты мы не чакаем, — падкрэсліла яна.

Гэта датычыцца і цэн на ікру:

— Калі прадукт не беларускай вытворчасці, абмежаваць сабекошт мы не можам. Таму мы будзем больш прадметна глядзець на цэны, якія фарміруюцца імпарцёрам і гандлем. Мяркую, парушэнняў тут не будзе. Масавы продаж ікры чакаецца ў снежні, тады мы зможам аддаць гэтаму больш увагі. А што датычыцца беларускіх вытворцаў, цана фарміруецца згодна з пастановай № 713.



Прадстаўнік МАРГ падкрэсліла, што міністэрства праводзіць штотыднёвы кантроль як за забеспячэннем спажыўцам шырокага асартыменту тавараў, так і за цэнаўтварэннем і выкананнем заканадаўства аб гандлі і грамадскім харчаванні.

## Аб шакаладзе і шампанскім

Сёлета прадпрыемствы канцэрна «Белдзяржхарчпрам» запланавалі выпусціць 2 мільёны 600 тысяч салодкіх навагодніх падарункаў. З іх «Камунарка» вырабіць 1 500 000 і «Спартак» — 1 100 000 штук. Для параўнання ў 2016 годзе прадпрыемствамі канцэрна было выпушчана ў цэлым 1 600 000 падарункаў. Такія лічбы прывяла намеснік начальніка ўпраўлення — **начальнік аддзела каардынацыі паставак тавараў на ўнутраны рынак упраўлення каардынацыі паставак тавараў на ўнутраны рынак і знешнегандлёвай дзейнасці канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Алена БЕЛАНОВІЧ.** Зрэшты, паводле статыстыкі, і дзяцей (галоўных «адрасатаў» салодкіх навагодніх падарункаў) у Беларусі за пяць гадоў стала больш, звярнула яна на гэта ўвагу.

— Падарункі фасуюцца ва ўпакоўкі розных форм і памераў, прадугледжана каля 80 найменняў вагой ад 250 грамаў да 3 кілаграмаў, — адзначыла Алена Белановіч. — Асартымент разнастайны, на любы густ і кашалёк.

Адпускныя цэны — ад васьмі да 85 рублёў без ПДВ, расказала спецыяліст. Для спажыўцоў, паўторымся, цана салодкага падарунка складзе ў сярэднім ад 9,5 да 100 рублёў. Яны ёсць ужо ў продажы: увагу пакупнікоў прыцягваюць, напрыклад, яркія мінічамаданчыкі з цукеркамі ад «Камунаркі», а «Спартак» у сваіх фірменных крамах прапануе выбраць пакаванне і самастойна сабраць «начынку» салодкага падарунка з самых любімых відаў цукерак. «Слодыч» працягвае ўжо ўпадабаную пакупнікамі навагоднюю тэму «Упрыгож пячэньку».

Што датычыцца шампанскага і пеністых він, пад келіх якіх у навагоднюю ноч прынята загадваць жаданне, то іх прадпрыемствамі канцэрна выпускаецца 25 відаў, пяць з якіх — новыя і выпушчаны сёлета да навагодніх свят, а 14 найменняў — гэта толькі «Савецкае шампанскае», паведаміла Алена Белановіч. У цэлым за лістапад ужо выраблена 124 тысячы dal (дэкалітр, мера ў вінаробстве, роўная 10 літрам) шампанскага і пеністых він, на ўнутраны рынак пастаўлена 182 тысячы dal.

— У снежні запланавана вырабіць 123 тысячы dal толькі шампанскага і 14 тысяч dal пеністых він, — дадала прадстаўнік канцэрна «Белдзяржхарчпрам». — На ўнутраны рынак плануем паставіць 190 тысяч dal толькі за снежань.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота аўтара і з адкрытых крыніц.**

# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «ЧЫТАЦЬ З НАМІ — УТУЛЬНА»

### I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Чытаць з намі — утульна» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі тэрмінам з 1 снежня 2024 года да 31 сакавіка 2025 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» і газету «Літаратура і мастацтва» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2025 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месцазнаходжанне: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

### II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Чытаць з намі — утульна» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Чытаць з намі — утульна» складае 673,00 (шэсцьсот семдзесят тры) рублі.

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Масляны радыятар Neoclima NC 9309 (далей — суперпрыз) | 1 | 190,00 | 190,00 |
| 2 | Канвектар Edisson Polo 1500 M, (далей — прыз) | 7 | 7 | 7483,00 |

### III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Чытаць з намі — утульна» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» і газету «Літаратура і мастацтва» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2025 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» або газету «Літаратура і мастацтва» на першы квартал або першае паўгоддзе 2025 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 1 снежня 2024 года да 22 студзеня 2025 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка газеты «Звязда» або газеты «Літаратура і мастацтва», якая змяшчаецца ў газеце «Звязда» і газеце «Літаратура і мастацтва» не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 снежня 2024 года да 17 студзеня 2025 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш чым адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксераксапіраваныя або тыя, якія паступілі ва Установу пасля 22 студзеня 2025 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

### IV. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ

9. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца 28 студзеня 2025 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

10. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя празрыстыя скрыні і старанна перамешваюцца.

11. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываецца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

12. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні арганізатар Гульні. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваецца арганізатар Гульні.

13. Вынікі розыгрышу публікуюцца да 5 лютага 2025 года ўключна ў газеце «Звязда» і газеце «Літаратура і мастацтва».

Установа ў тэрмін да 5 лютага 2025 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

### V. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

14. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» або газету «Літаратура і мастацтва» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2025 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» або газету «Літаратура і мастацтва» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2025 года.

15. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» або газету «Літаратура і мастацтва» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2025 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

16. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 31 сакавіка 2025 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00 з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонам: (017) 271-81-53, 311-17-40 для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, установа не аплачвае.

17. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

18. Пасля 31 сакавіка 2025 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

### VI. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

19. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

20. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

21. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Чытаць з намі — утульна» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» і газеце «Літаратура і мастацтва».

22. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах: (017) 271 81 53, 311 17 40.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

## Вобразы шчасця Галіны Польскіх

**Напрыканцы месяца, 27 лістапада, сваё 85-годдзе адзначыла актрыса тэатра і кіно, народная артыстка РСФСР Галіна Польскіх. З нагоды юбілею ў тэлеэфіры нас чакаюць паказы мастацкіх і дакументальных фільмаў з удзелам артысткі.**



На сацыякультурным у нядзелю, 1 снежня, нам пакажуць сямейную меладраму «Нядзельны тата» (1985 г.) рэжысёра Навума Бірмана. Сям'я развальваецца на вачах маленькага хлопчыка Алёшы. Галіну Польскіх мы ў кадры сустракаем у ролі бабулі, Зоі Аляксандраўны. Акрамя актрысы, у фільме зняліся таксама Барыс Шчарбакоў, Дзмітрый Гранкін, Юрый Дуванаў, Тамара Акулава, Віктар Шульгін. Ці здолее дзіця сваімі хітрыкамі прадухіліць распад сям'і, а галоўнае, як гэтыя дзеянні паўплываюць на лёсавызначальнае рашэнне дарослых, мы даведаемся ў нядзелю раніцай на тэлеканале «Беларусь 3».

А вось на тэлеканале «Расія-Культура» ў нядзельным эфіры гледачоў чакае паказ мастацкай стужкі «Дзікі сабака Дзінга» («Ленфільм», 1962 г.) рэжысёра Юлія Карасіка. Фільм знялі па аповесці Рувіма Фраермана «Дзікі сабака Дзінга, ці Аповесць пра першае каханне» (1939 г.). Варта адзначыць, амаль што для ўсіх выканаўцаў галоўных роляў гэтая кінапраца стала дэбютам. Хутчэй за ўсіх знайшлі акцёра на ролю Колі Сабанеева. Рэжысёр, убачыўшы фотаздымкі Уладзіміра Асобіка, зацвердзіў яго без проб. А вось актрысу на ролю Тані Сабанеевай шукалі даўжэй за ўсіх. І члены мастацкага савета нават вельмі здзівіліся, калі ім прадставілі 22-гадовую Галіну Польскіх. Аднак студэнтку зацвердзілі на ролю школьніцы.

У фільме таксама задзейнічаны такія артысты, як Ганна Радзівонава, Іна Кандрацьева, Мікалай Цімафееў і іншыя. Не прапусціце паказ на канале «Расія-Культура» ў 14.55.

Таксама 1 снежня на тэлеканале АНТ да 85-годдзя артысткі пакажуць дакументальны фільм "Па сямейных абставінах" (2014 г.) Ганны Гуляевай. ...Галіну Польскіх немагчыма забыць. На яе рахунку больш за паўтары сотні роляў. І амаль у кожнай яна — ідэал жанчыны, каханай, маці. Аднак асабістае жыццё актрысы далёкае ад кіиаказкі, у ім было нямала складанасцяў і гора. Яна рана страціла бацькоў. Ад інтэрната дзяўчынку ўратавала бабуля, якая з Беларусі пераехала ў Маскву, каб выхоўваць унучку.

І ў адказ на гэта дзеля бабулі дзяўчынка была гатовая на ўсё. Галіна любіла кіно, і ёй здавалася, нібыта артысткі жывуць нейкім незвычайным, казачным жыццём. Гэта і падштурхнула Галіну Аляксандраўну да паступлення ва Усерасійскі дзяржаўны ўніверсітэт кінематаграфіі імя С. А. Герасімава. Першы шлюб актрысы скончыўся трагічна: муж загінуў падчас здымак фільма. А ў другім сямейнае жыццё неяк не склалася. І замуж яна больш ужо не выходзіла, хоць прыхільнікаў было шмат заўсёды. Дачок выхоўвала ў адзіночку. Але яе галоўным захапленнем было і застаецца кіно. Адной ролі ў Георгія Данэлія ў фільме «Я крочу па Маскве» было б дастаткова, каб назаўсёды запомніцца гледачам... Як адзначаюць стваральнікі дакументальнай кінапрацы, нас чакае самае шчырае інтэрв'ю актрысы, дзе мы ўбачым не артыстку, а найперш жанчыну, з якой хочацца пагаварыць па душах і даведацца пра яе сакрэты шчасця.

**Алена ДРАПКО.**

На адной хвалі

## Новыя «Маладыя таленты Беларусі»

**Стаць пераможцам радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» — значыць зрабіць яшчэ адзін крок да прызнання ў асяроддзі прафесіяналаў. І творчае супрацоўніцтва гэтага года не стала выключэннем, бо ў выніку трох конкурсных тураў узнагарод удастоены 140 фіналістаў.**

На грандыёзным гала-канцэрце, які адкрыў цыкл святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 100-годдзю Беларускага радыё, выступілі лаўрэаты «Маладых талентаў Беларусі», а пераможцы ў інструментальным жанры нават прадэманстравалі сваё майстэрства ў суправаджэнні Сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі.

Уладальнікамі Гран-пры XIII Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» сталі: у намінацыі «Інструментальная музыка. Ансамблі» — Узорны інструментальны ансамбль «Джайв-акорд» з Жодзіна; у намінацыі «Інструментальная музыка. Салісты» — Аляксандра Смірнова (Магілёў); у намінацыі «Інструментальная музыка. Акадэмічныя інструменты. Салісты» пераможцам прызналі Ілью Кісялёва з Маладзечна; а ў намінацыі «Спадчына. Ансамблі» найлепшым стаў ансамбль народнай песні «Дзівінскія перапевы» з Наваполацка і ў намінацыі «Эстрадны вакал. Салісты» званне найлепшай дасталася Арыне Пехцеравай (Магілёў).

Лаўрэатамі І, ІІ і ІІІ ступеняў вызначаны 79 салістаў і калектываў, спецыяльных дыпломаў удастоены 11 удзельнікаў. Поўны спіс імён пераможцаў можна знайсці на афіцыяльным сайце радыё «Культура» www.radiokultura.by.

Не толькі памятныя прызы атрымаюць пераможцы, але і ўнікальныя магчымасці: ратацыю ў эфіры самага інтэлігентнага радыё краіны і запрашэнне на ўдзел у здымках тэлевізійнага гала-канцэрта «Маладыя таленты Беларусі — 2024».

Нагадаем, што праект праводзіцца з 2009 года і за гэты час удзел у творчым спаборніцтве прыняло ўжо больш за чатыры тысячы выканаўцаў і калектываў з усёй краіны. З 2013 года прызёры конкурсу рэгулярна становяцца стыпендыятамі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

**Алена ДРАПКО.**

### Беларусь 1

**6.10 Меладрама «Дзяўчына з вачыма колеру неба» (12+).**
7.55 Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.20** «Арсенал» (12+).
**9.50 Меладрама «Здані мінулага» (12+).**
**11.50** Беларуская супержанчына.
**12.20** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.45** Вакол планеты.
**13.25, 22.35 Меладрама «Старое піяніна» (12+).**
**15.25 Меладрама «Той мужчына, тая жанчына» (12+).**
**19.10** «Героі» (6+).
**20.40** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** Нашыя навіны.
**7.10 Фільм «Ружы на шкле» (12+).**
**9.10** «Метэагід».
**9.35** «Здароўе» (16+).
**10.40** «Народны кухар» (12+).
**12.05** «Смех з дастаўкай дадому» (16+).
**13.25, 16.20 Фільм «Шчасце па дагаворы» (12+).**
**17.50** «Час нашых перамог» (12+).
**20.00** Контуры.
**21.15 Фільм «З пачуцця абавязку» (16+).**
**1.30** «Што? Дзе? Калі?» (16+)
**2.40** Заканчэнне вяшчання.

### СТБ

**7.00 «Чалавек з бульвара Капуцынаў» (16+).**
**8.45** Дак. праект (12+).
**9.50** «Беларуская супержанчына».
**10.00** «Вялікі горад».
**10.30, 13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**10.40** Дак. праект «Тайная гісторыя ежы» (12+).
**12.25, 13.45, 17.00, 21.15 «Неўскі. Цень Архітэктара». Серыял (16+).**
**16.45** «Сенат».
**19.30** «Тыдзень».
**20.50** «Слова і справа».
**21.00** «Спорт-таймер».
**0.10** Дак. праект «90-я» (16+).

### МІР

**5.00** Мультфільмы (6+).
**5.45** «Наша кіно. Неўвядальныя» (16+).
**6.15 Маст. фільм «Старамодная камедыя» (16+).**
**8.10** Дак.фільм «Саюз непарушны» (16+).
**8.55** «Дыктар робіць» (16+).
**9.30** «ФазэндаЛайф» (6+).
**10.00, 16.00** Навіны.
**10.15 Маст. фільм «Юнацтва Пятра» (16+).**
**13.15 Тэлесерыял «Пётр Першы (16+).**
**16.20 Тэлесерыял «Пётр Першы. Завяшчанне» (16+).**
**18.30, 0.00** «Разам» (16+).
**19.30 Маст. фільм «Вакзал для дваіх» (16+).**
**22.25 Маст. фільм «Дзе знаходзіцца «нофелет?» (16+).**
**1.00 Маст. фільм «Чыста англійскае забойства» (16+).**
**3.45 Тэлесерыял «Бомба» (16+).**

### Першы Інфармацыйны

**5.00, 5.30, 8.40, 9.25, 10.30, 11.30, 12.25, 13.30, 14.40, 15.35, 17.30, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 1.00, 3.00** Навіны. Дайджэст.
**5.05, 5.35, 6.15, 7.10, 8.10, 14.50, 16.50, 0.25, 1.05, 2.20, 3.05, 4.20** Дзень спорту.
**5.15, 6.40, 10.10, 17.35, 20.05** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**5.45, 7.45, 8.45, 11.35, 14.25, 15.20, 22.15, 23.15** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**6.05, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** Вынікі тыдня.
**6.25, 7.20, 9.20, 12.55, 19.45** Сусветная навука (12+).
**7.15, 12.30, 17.55, 19.50** Аўтарскі погляд (12+).
**8.20, 9.30, 10.35, 13.35, 19.15, 21.15, 22.30, 23.30, 3.10, 4.25** Тэлефільм (12+).
**9.00, 10.00, 11.50, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 15.40, 17.00, 19.00, 22.55** Навіны.
**11.00, 14.05, 0.30** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**11.20, 14.45** Вам тэлеграм (12+).
**12.35, 15.45, 18.40, 01.10** Твой горад (12+).
**13.20, 17.20, 19.10, 21.55, 0.50, 3.50** Громаў LIVE (12+).
**16.00, 18.00** Вакол планеты (12+).

**20.35** Зразумелая палітыка (12+).
**0.05, 2.00, 4.00** Галоўны эфір.
**1.30, 2.30** Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

**7.05** Фільм «Верыць нельга зманіць» (16+).
**10.15** «Рэцэпт сапраўднага беларуса».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.35** «Свае».
**11.50** «Парад гумару» (16+).
**15.00 Фільм «Пакуль не выпаў снег...» (12+)**
**16.30 Серыял «Фантазёр» (12+).**
**17.00, 19.05** «Песні ад усёй душы» (12+).
**18.00** «Сіняя птушка».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.00** «Акцэнты».
**22.00** «САСС упаўнаважаны заявіць».
**22.55** Масква. Крэмль. Пуцін.
**23.30** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.20** «Погляд на Беларусь» (12+).
**6.50** Сэнс жыцця (12+).
**7.20** Беларусы (6+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Навука побач» (6+).
**8.55** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**9.25** Ежа хоць куды (6+).
**10.25** Сямейная справа (6+).
**10.45** «Кватэрнае пытанне.by» (12+).
**11.20** «Першая перадача» (16+).
**12.00** «Цуд тэхнікі» (12+).
**12.50** «Дачны адказ» (0+).
**13.55** Час выбраў нас (12+).
**16.20** «Следства вялі...» (16+)
**18.05** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.20** Шоу «Аватар».
**22.45** «Зоркі сышліся» (16+).

### Беларусь 3

**7.15** «Казка пра залатога пеўніка». Мультфільм (0+).
**7.45** «Веды ў кубе».
**8.25 «Над Цісай». Маст. фільм (12+).**
**9.50** «Наперад у мінулае».
**10.30** «Беларуская кухня».
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.50, 20.00** «Культурны тыдзень».
**12.25** «Спяваю і ўсё паспяваю».

**12.50 «Дзе знаходзіцца нафелет?» Маст. фільм (12+).**
**14.15** «Я — художнік, я так вижу!»
**14.40 «Жорсткі раманс». Маст. фільм (12+).**
**17.00** «Суперлато».
**17.30** «Кадры жыцця».
**18.25 «Максім Перапяліца». Маст. фільм (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Гардэмарыны, наперад!» Маст. фільм (12+).**

### Беларусь 5

**6.55** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Спартак» (Масква) — ФК «Ніжні Ноўгарад».
**8.55** Біятлон. Кубак Расіі. Ханты-Мансійск. Жанчыны.
**9.50** Фіз-ра.
**10.20** Агляд НХЛ.
**11.00** Дзюдо.
**12.00** Біятлон. Кубак Расіі. Ханты-Мансійск. Мужчыны.
**12.55** Баскетбол. Турнір памяці В. М. Рыжанкова. Дзяўчыны. Беларусь — БК «Самара».
**14.50** На спорце.
**15.10** Баскетбол. Турнір памяці В. М. Рыжанкова. Юнакі. Беларусь — «Лакаматыў-Кубань».
**16.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва-Мінск». У перапынках «Спорт-цэнтр».
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Расіі. ФК «Краснадар» — «Лакаматыў» (Масква). У перапынку «Спорт-цэнтр».
**21.25** Вынікі тыдня.
**22.05** Каратэ. Кубак Беларусі.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся». Найлепшае за тыдзень» (12+).
**9.00, 10.35, 15.35** Тэлебарометр.
**9.05** «На нажах» (16+).
**10.05** Я з вёскі (12+).
**11.05** Смачна есці (12+).
**11.55** «Карысная праграма» (16+).
**12.05** «Дзіця з пекла» (16+).
**13.20** «Дарослым не зразумець» (12+).
**14.20** «Мама дарагая!» (16+)
**15.40** «10 самых...» (16+)
**16.15 Камедыя «Навагодні перапалох» (12+).**
**17.45** «Уральскія пельмені».
**19.10 Баявік «Вальда» (16+).**
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15 Серыял «ІП Пірагова» (16+).**



### 8 канал

**7.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад.
**7.20** «Сланечнікі» (16+).
**9.10** «Серыял па вашых просьбах».
**11.30** «Паляванне і рыбалка».
**11.50** «Асалам алейкум, Беларусь!»
**12.00** Фільм-катастрофа «Вулкан» (16+).
**13.45** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**13.50** «Любімае кіно».
**15.25** Гістарычная драма.
**17.10** «Экспрапрыятары» (12+).
**18.55, 21.00** «Надвор'е».
**19.00** «Мажор» (16+).
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Урокі Лазуркіна».
**21.10** Серыял «Гульня» (16+).
**23.05** Драма «Доктар» (18+).
**1.05** «Начны сеанс».

### Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.00** Легенды сусветнага кіно.
**7.35, 13.55** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**7.50** «Дзікі сабака дзінга». Маст. фільм.
**9.30** Неўскі каўчэг. Тэорыя немагчымага.
**10.00, 12.30, 16.30, 18.45, 23.55** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10** XX стагоддзе.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00** Лінія жыцця.
**14.10** «Міласцівыя гасудары». Маст. фільм.
**15.25** «Агора».
**16.45** «Перадзвіжнікі. Кірыл Лемах».
**17.15** «Апавяданні з рускай гісторыі».
**19.00** Урачыстае закрыццё XXV Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу юных музыкантаў «Шчаўкунчык».
**21.35** «Сацi. Нясумная класіка...»

**22.15** «Мегрэ». Тэлесерыял.
**0.10** «Магістр гульні». Аўтарская праграма.
**0.40** «Расія Марка Антакольскага». Дак. фільм.
**1.35** «Жыццё і смерць дваранiна Чартапханава». Маст. фільм.

### Настальгія

Настальгія Панядзелак, 02 снежня.
**6.00** Маст. фільм «Адночы летам» (16+).
**7.05, 11.40, 17.30, 19.15, 20.45, 21.40, 23.30, 1.00, 3.40, 5.30** Музычная Настальгія (12+).
**7.25** «Добры вечар, Масква!» (16+)
**9.00** «Быў час» (16+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (16+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (18+).
**12.00** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**12.45** Маст. фільм «Чырвонае і чорнае» (16+).
**18.00** «СевАлогія» (18+).
**19.25** Маст. фільм «Даліна фараонаў» (16+).
**21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**0.00** «Да і пасля...» (16+)
**1.15** Маст. фільм «Дама без камелій» (16+).

### EuroSport 1

**3.30** Веласпорт-трэк. Ліга чэмпіёнаў (16+).
**5.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Мужчыны (16+).
**6.00, 13.30, 14.30, 2.00** Скачкі на лыжах з трампліна (6+).
**7.00, 16.00, 0.00** Снукер (6+).
**9.00, 9.45, 20.00, 21.00** Горныя лыжы (6+).
**10.30, 12.00, 22.00** Веласпорт-трэк (6+).
**18.00, 19.00** Біятлон (6+).

### Кінакамедыя

**1.05** «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях» (16+).

**3.10** «Модная штучка» (12+).
**5.00** «Хэпі-энд» (12+).
**6.50** «Непаслушнікі» (12+).
**9.00** «Сардэчна запрашаем у сям'ю» (16+).
**11.15** «Секс па сяброўстве» (18+).
**13.15** «Ілюзія падману» (16+).
**15.20** «Пачні спачатку» (16+).
**17.15** «Дарога на Вэлвіл» (12+).
**19.30** «Зялёная кніга» (16+).
**21.50** «За Палыча!» (12+)
**23.40** «Мастацтва на паляццах» (18+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.30** «Доктар І...» (16+)
**8.55, 16.40** «Арлінская» (16+).
**10.35** «Паглядзім» (16+).
**11.10** «10 самых» (16+).
**11.45** «Сны» (16+).
**12.40, 18.25, 2.20** «Сляпая» (16+).
**14.05, 19.50, 3.10** «Важбіткa» (16+).
**15.40** «Новыя містычныя гісторыі» (16+).
**21.30** «Ліса».
**23.20** «Я іду цябе шукаць».
**0.25** «Яшчэ адна з роду Балейн».
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

### ТБ1000

**6.40** Выкрадзі маю жонку (18+).
**8.40, 23.45** Забойствы ў ... (16+)
**10.30** Мой найлепшы палюбоўнік (16+).
**12.45** Каханне не па сцэнарыі (16+).
**14.55** Выпадковы муж (16+).
**16.40** Гонка (16+).
**19.00** Пеле: нараджэнне легенды (16+).
**21.05** Малая на мільён (16+).
**1.30** Замуж на 2 дні (16+).

**3.10** Жаніх напракат (16+).
**4.25** Дзікая парачка (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** «Тры каты» (6+).
**6.20** «Смяшарыкі» (6+).
**7.15** «Царэўны» (6+).
**8.15** «Вій» (16+).
**10.45** «Таямніца пячаткі дракона» (12+).
**12.55** «Пальма» (6+).
**15.00** «Я худзею» (16+).
**17.00, 17.55** «Практыка» (16+).
**18.55** «Сэрца Пармы» (16+).
**21.55** «Вікінг» (16+).
**0.25** «Табол» (16+).
**2.15** «Бармен» (16+).
**3.45** «Гудбай, Амерыка» (12+).
**5.20** «Як ільвяня і чарапаха спявалі песню» (6+).

### ЯСНАе

**5.25** Серыял «Радзіма чакае» (16+).
**7.10** Серыял «Застава Жыліна» (12+).
**8.40** «Чалавек і здароўе».
**9.00** Серыял «Перавозчык» (16+).
**10.35** Серыял «Мянтоўскія войны-7» (16+).
**12.10** Серыял «Мажор» (16+).
**14.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Смаргонь» — «Дынама-Мінск».
**16.00** Серыял «Неўскі-2. Праверка на трываласць» (16+).
**17.45** Серыял «Група Zeta-2» (16+).
**19.20** Серыял «Шэф. Гульня на павышэнне» (16+).
**21.00** «Ясна аб футболе».
**21.30** «Ясна аб хакеі».
**22.05** Серыял «Запаведны спецназ-2» (16+).
**23.50** Маст. фільм «Бацька» (12+).
**1.20** Серыял «Смерць шпіёнам. Скрыты вораг» (16+).
**3.10** Маст. фільм «У тумане» (12+).

### ЗВЯЗДА

**6.00, 6.45, 7.30, 8.15, 9.00** «Курсанты» (16+).
**9.45, 10.40, 11.35, 12.30** «Мемарандум Парвуса» (16+).
**13.25** «Бацька». Маст. фільм (12+).
**15.00** «Чаклун і Румба». Маст. фільм (12+).
**16.25, 23.30** «Гарады-героі. Мінск». Дак. фільм (12+).
**17.25** «Паміж мірам і вайной. Звязаныя вайной». Дак. фільм (12+).
**17.40** «Дзяржаўная граніца. «Кур'еры страху». Маст. фільм (12+).



**19.30, 23.00** «168 гадзін».
**20.00, 20.50** «Без права на выбар» (16+).
**21.45** «Руіны страляюць...» Маст. фільм (12+).
**0.30** «Дзве гісторыі, адзін Афганістан». Дак. фільм (12+).
**0.55** «Радзіма» або смерць. З Надзеяй — за Францыю». Дак. фільм (12+).
**1.25** «Бітва за Кобрын. Заложнікі сакрэтнага пакта». Дак. фільм (12+).
**1.55** «Крылы Саветаў. Агонь у адказ». Дак. фільм (12+).
**2.25** «А-229. Сакрэтная зброя Крамля». Дак. фільм (12+).
**2.55** «Георгій Жукаў. Капкан для камкора». Дак. фільм (12+).
**3.25** «Жанчына. Выпрабаванне вайной». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**8.15, 23.50** Зона Х (16+).
**9.15** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**10.10 Серыял «След» (16+).**
**11.05** Час выбраў нас (12+).
**12.25, 0.25** «Скажынемаўчы».
**13.20, 15.25 Меладрама «Дажыць да кахання» (12+).**
**15.15, 18.45** Навіны рэгіёна.
**17.40, 20.45** «Фактар.by».
**17.45** «100 пытанняў даросламу» (12+).
**19.00** Клуб рэдактараў (16+).
**20.00** Панарама.
**20.15** «Дзермант. Сэнсы».
**20.25, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45 «Неўскі. Цень Архітэктара». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+)
**12.20, 13.15, 22.55 Фільм «Капітанша» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.30** «Трывожная кнопка» (16+).
**18.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**19.05** «Поле цудаў» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.20** «Лаўроў. За гранню» (16+).
**21.30** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі (16+).
**0.55** Час.
**1.40** Заканчэнне вяшчання.

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект «Абскарджанню не падлягае» (16+).
**10.40** Дак. праект «Армагедон» (12+).
**13.50, 0.50 «Спецбат». Серыял (16+).**
**16.50** «Міншчына».
**17.00** «Крокі Незалежнасці».
**17.20** «Рашэнне ёсць! Дэпутацкі адказ».
**17.50** Дак. праект (16+).
**18.45** «У пошуках ісціны. Маланка».

## МІР

**5.00** Дак. фільм «Час магчымасцяў» (12+).
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**6.15, 10.10, 17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**7.55, 14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**9.00, 15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**10.35** Дак.фільм «Саюз непарушны» (16+).
**11.15 Маст. фільм «Чаканне палкоўніка Шалыгіна» (16+).**
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**18.50** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**19.30 Маст. фільм «У зоне асаблівай увагі» (16+).**
**21.35 Маст. фільм «Ход у адказ» (16+).**
**23.20 Маст. фільм «Выпадак у квадраце 36-80» (16+).**
**0.55 Маст. фільм «Вій» (16+).**
**2.10** Дак. фільм «Спітак» (16+).
**2.40** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**3.30 Маст. фільм «Белы ікол».**
**4.50** Мультфільмы (6+).

## Першы Інфармацыйны

**5.00, 5.25, 6.05, 6.30, 7.45, 8.50, 9.45, 10.30, 11.30, 11.55, 12.25, 13.40, 14.35, 15.35, 17.40, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 0.05, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны. Дайджэст.
**5.10, 5.40, 6.15, 6.40, 14.40** Навіны эканомікі (12+).
**5.20, 5.50, 6.25, 7.40, 9.40, 14.50, 18.50, 0.15, 1.10, 2.10, 3.10, 4.10** Дзень спорту.
**5.45, 7.55, 9.50** Тэхнагайд (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**6.50, 8.45, 10.20, 13.35** Прэсагляд (12+).
**7.00, 8.00, 8.40, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 15.40, 16.00, 17.00, 18.30, 19.00, 19.50** Навіны.
**10.05, 17.45, 20.35, 2.15, 3.30, 4.15** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**10.35, 13.45, 15.20, 18.15, 20.05, 22.15, 23.15, 1.15, 3.15** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**11.05, 11.35, 14.05, 21.15, 23.30, 0.20, 4.30** Тэлефільм (16+).
**12.30, 1.30, 2.30** Дак. фільм (12+).
**16.05** Час выбраў нас! (12+)
**18.00** Навіны рэгіёна.
**18.35, 21.55** Аўтарскі погляд (12+).
**19.35, 22.35** Зразумелая палітыка (12+).
**22.50, 0.50, 3.45** Навіны-сеткі (12+).

## РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05** «Новая раніца».
**9.05, 10.05 Серыял «Райскі» (16+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.50** «Кропкі над «і» (16+).
**13.50** Гумарыстычная праграма (16+).
**14.40, 17.40 Тэлесерыял «Тайны следства» (16+).**
**15.30** «60 хвілін».
**18.45** «Прамы эфір» (16+).
**21.30, 23.15** Фільм «Другая маладосць» (16+).
**23.45** «Людзі і страсці Алісы Фрэйндліх».
**0.35 Фільм «Небяспечны ўзрост» (16+).**

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.10, 8.25, 13.20, 22.40, 23.40** Сёння.
**6.20** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.25** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** «НЗ.by».
**9.00, 10.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**12.35** «Без тэрміну даўнасці» (12+).
**13.25** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.55** Час выбраў нас (12+).
**15.00** «Чакай мяне» (12+).
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15** «Экспертыза злачынстваў» (16+).
**20.45, 22.20, 22.45 Серыял «Балабол» (16+).**
**21.50** «НЗ.by: час вынікаў».
**23.20, 23.55 Серыял «Пустыя гарады» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.30** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 16.45, 20.30, 23.25** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Гурзуф». Маст. фільм (16+).**
**9.55, 22.50** «Вайна ў кадры і за кадрам». Дак. фільм (12+).
**10.35, 19.15** «Лёс». Фільм другі (12+).
**11.50** «Тэатральныя гісторыі Нясвіжа». Дак. фільм.
**13.10** «Легенды кіно» (12+).
**13.50 «Маладыя людзі». Маст. фільм (12+).**
**15.00** Сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі.
**16.20** «Сіла веры».
**17.00** «Архітэктура Беларусі».
**17.15 «Іванава дзяцінства». Маст. фільм (12+).**
**18.50** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.40** «Новыя людзі».

## Беларусь 5

**6.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Авіятар» (Баранавічы).
**8.55** Біятлон. Кубак Расіі. Жанчыны.
**10.15** Більярдавы спорт.
**11.05** На спорце.
**11.20** Авертайм.
**11.50** Хакей. КХЛ. «Амур» (Хабараўск) — «Дынама-Мінск».
**14.20** Біятлон. Кубак Расіі. Ханты-Мансійск. Мужчыны.
**15.30** Змешаныя адзінаборствы.
**19.30** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва-Мінск». У перапынках «Спорт-цэнтр».
**21.50** Бокс.
**23.00** Спорт-цэнтр.
**23.10** Хакей. КХЛ. «Амур» (Хабараўск) — «Дынама-Мінск».

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05 Дэтэктыў «Марозава» (16+).**
**12.15 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).**
**13.05** Суд вырашыць (16+).
**14.15** Сямейныя гісторыі (16+).
**14.55** «Дарослым не зразумець» (12+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00** «Абмен дамамі» (16+).
**18.25** «Стаць шэфам» (16+).
**20.15, 21.15** «Уральскія пельмені» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
21.50 Баявік «Вальда» (16+).



## 8 канал

**7.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад.
**7.20** Трылер «Ледзяная дрыготка» (12+).
**8.55** Серыял «Ліквідацыя».
**10.25** «Дакументальны экран».
**11.15** «Гатуй як шэф» (12+).
**11.25** Трылер «Крушэнне» (16+).
**13.15** Камедыя «Нотынг Хіл» (12+).
**15.25** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**15.30** Гістарычная драма.
**17.15** «Экспрапрыятары» (12+).
**18.55, 21.05** «Надвор'е».
**19.00** «Мажор» (16+).
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10** «Урокі Лазурскіна».
**21.15** «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**21.25** Серыял «Гульня» (16+).
**23.20** Драма «Першае каханне» (16+).
**1.00** «Начны сеанс».

## Культура

**6.30** «Прастольнае свята. Уводзіны ў храм Прасвятой Багародзіцы». Дак. фільм.
**7.15** Адліга.
**7.30, 0.00** Прыступкі цывілізацыі.
**8.20, 22.15** «Мегрэ». Тэлесерыял.
**10.00, 12.30, 16.30, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.50** XX стагоддзе.
**11.45** «НОВАТ. Лібрэта ў 15 карцінах». Дак. фільм.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00** Штучны адбор.
**13.45** «Жыццё і смерць дваранiна Чартапханава». Маст. фільм.
**15.00** «Белая студыя».
**15.45** «Тайныя палацы Эрмітажа». Дак. фільм.
**16.45** «Біблейскі сюжэт».
**17.15** Сімфанічныя аркестры Расіі.
**17.45** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**18.00** Жыццё выдатных ідэй.
**18.25** «Цяперашняе-мінулае. Пошукі і знаходкі». Дак. серыял.
**19.00** Урокі рускага чытання.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.35** «Абсалютны слых».
**21.15** Лінія жыцця.
**1.50** «Зацішша». Маст. фільм.

## Настальгія

**6.00** «СевАлогія» (18+).
**7.15, 8.45, 9.40, 11.30, 12.55, 14.40, 15.40, 17.30, 20.40, 21.40, 23.35, 5.30** Музычная Настальгія (12+).
**7.25** Маст. фільм «Даліна фараонаў» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (16+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб». 1997 г. (18+).
**12.00** «Быў час» (16+).
**13.10** Маст. фільм «Аголеная шпора» (16+).
**14.50** «Калі хочаш быць здаровым» (16+).
**18.00** «Спяем, сябры!» (16+)
**19.00** Маст. фільм «Капальні цара Саламона» (16+).
**0.00** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**0.45** Маст. фільм «Чырвонае і чорнае» (16+).

## EuroSport 1

**3.30, 7.00, 10.30, 14.00, 15.45, 21.45** Снукер (6+).
**5.30** Велаcпорт-трэк. Ліга чэмпіёнаў (16+).
**9.00, 2.00** Велаcпорт-трэк (6+).
**12.30, 21.00** Біятлон (6+).
**20.00** Конны спорт (6+).

## Кінакамедыя

**1.10** «Астэрыкс і Абелікс: Паднябесная» (16+).
**3.50** «Няспячыя ў Сіэтле» (12+).
**5.45** «За Палыча!» (12+)
**7.30** «Секс па сяброўстве» (18+).
**9.30** «Ілюзія падману» (16+).
**11.35** «Пачні спачатку» (12+).
**13.30** «Дарога на Вэлвіл» (12+).
**15.45** «Вася не ў сабе» (16+).
**17.35** «Круцей няма куды» (16+).
**19.30** «Абарона ад дурня» (18+).
**21.15** «Змёрзлая з Маямі» (16+).
**23.05** «Прастачка» (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.35** «Містычныя гісторыі» (16+).
**10.35** «Глядзі сам» (16+).
**10.50, 16.35** «Маё цудоўнае жыццё».
**12.35, 18.25** «Сляпая» (16+).
**14.00, 19.50, 3.25** «Варажбітка» (16+).
**15.35** «Любоўная магія».
**21.30** «Ліса».
**23.30** «Я іду цябе шукаць».
**0.35** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**1.30** «Хуткасць».
**3.50** «Уцёкі ад славы» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**6.15** Ідэальныя ўцёкі (16+).
**8.05, 22.50** Забойствы ў ... (16+)
**10.05** Пакой жаданняў (16+).
**12.05** Чалавек-матылёк (16+).
**14.25** Турыст (16+).
**16.25** Прылады смерці: Горад касцей (16+).
**19.00** Нябачны хлопчык (16+).
**21.00** Нябачны хлопчык: другое пакаленне (16+).
**0.45** Зялёная кніга (16+).
**2.45** 12 гадоў рабства (16+).
**4.45** Дварэцкі (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** «Тры каты» (6+).
**6.25** «Смяшарыкі» (6+).
**7.35** «Царэўны» (6+).
**9.00** «Вавёрка і Стрэлка: Карыбская таямніца» (6+).
**10.30** «Ён — Дракон» (12+).
**12.30** «Дзявятая» (16+).
**14.20** «Ваўкадаў з роду Шэрых Сабак» (16+).
**17.00, 17.55** «Практыка» (16+).
**18.55** «Авечка Долі была злая і рана памерла» (16+).



**21.10** «Адной левай» (16+).
**22.45** «Пацалунак скрозь сцяну» (16+).
**0.20** «Чалавек з будучыні» (16+).
**1.40** «Кожны марыць пра сабаку» (6+).
**3.05** «Ёлкі кудлатыя» (6+).
**4.25** «Казка аб рыбаку і рыбцы» (6+).

## ЯСНАе

**4.25** Серыял «Радзіма чакае» (16+).
**6.10** Серыял «Магістраль» (16+).
**7.55** «Раніца ЯСНАя».
**9.00** Серыял «Перавозчык» (16+).
**10.35** Серыял «Мянтоўскія войны-7» (16+).
**12.10** Серыял «Мажор» (16+).
**14.05** Серыял «Праз прыцэл» (12+).
**15.50** Серыял «Неўскі-2. Праверка на трываласць» (16+).
**18.25** Серыял «Шэф. Гульня на павышэнне» (16+).
**21.00** «Сувязісты».
**21.25** «Хронас».
**22.00** Серыял «Гарачая кропка» (16+).
**23.40** Маст. фільм «Справа для сапраўдных мужчын» (12+).
**0.50** Серыял «Смерць шпіёнам. Ударная хваля» (16+).
**2.30** Маст. фільм «На другім беразе» (12+).

## ЗВЯЗДА

**6.00, 23.30** «Сяргей Вайцяхоўскі. Генерал без Радзімы». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20** «Рубікон».
**7.30, 21.40** «Руіны страляюць...» Маст. фільм (12+).
**8.35, 13.30** «Доўгія вёрсты вайны». Маст. фільм (12+).
**9.55** «Дзяржаўная граніца. «Афганскі капкан». Маст. фільм (12+).
**11.40, 12.35** «Без права на выбар» (16+).
**14.40, 15.25** «Чырвоная капэла» (12+).
**16.10** «Гарады-героі. Тула». Дак. фільм (12+).
**17.05, 3.55** «Непадзельныя». Дак. фільм (12+).
**17.20** «Вяртанне ў Хатынь». Дак. фільм (12+).
**17.45** «Дзяржаўная граніца. «Смяротны ўлоў». Маст. фільм (12+).
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме».
**19.50, 23.20** «Спецыяльны рэпартаж».
**20.00, 20.50** «Лёс дыверсанта» (12+).
**22.45** «Паміж мірам і вайной. Разведка боем». Дак. фільм (12+).
**0.25** «Шпіён з-пад Вілейкі». Дак. фільм (12+).
**0.55** «22 чэрвеня. Асуджаны свет». Дак. фільм (12+).
**1.25** «Горад, які паўстаў з попелу». Дак. фільм (12+).
**1.55** «Хатынь. Засакрэчаная трагедыя». Дак. фільм (12+).
**2.25** «Бабруйскі вузел. Ліквідацыя». Дак. фільм (12+).
**2.55** «Вайна разведак. Курсанты асаблівага прызначэння». Дак. фільм (12+).
**3.25** «Контрразведка. Рассакрэчаны фронт». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*




## ПРА ЗІНУ І ЯЕ СУСЕДКУ ТОНЕЧКУ, якая любіць лета

...Неяк аднойчы задумалася: чаму гэта камедыі Гайдая і ведаеш, здаецца, на памяць, і ўсё роўна глядзіш?

Сама ў сябе спытала — і сама сабе адказала, што з імі ўсё зразумела, бо што ні фільм, то геніяльны сюжэт і такая ж ігра акцёраў...

А яшчэ, мне здаецца, што ім, тым самым геніям, у мінулым стагоддзі лягчэй было ствараць адпаведныя вобразы: вельмі шмат чаго можна было падгледзець у нашым такім бурлівым жыцці, шмат чаго пераняць, бо людзі, далібог, былі цікавейшыя — больш яркія, каларытныя, асабліва ў вёсках.

...Гэтыя дзве жанчыны Зіна і Тонечка — нягледзячы на рознасць характараў, узросту, поглядаў — жылі ў суседстве і добрай згодзе. Першай было за сорак: прыгожая, шумная, энергічная, яна вельмі шмат паспявала зрабіць і... сказаць таксама. Працуючы паштальёнкай, Зіна ведала ўсе навіны ў акрузе і дома ці не штовечар збірала «сяло»: разам з сяброўкамі абмяркоўвала іх, выдавала свае ацэнкі ўсім падзеям у краіне і свеце, у вясковым жыцці (за што Стасік, другі Зінаідзін сусед, называў «пасялух» агентамі ТАСС).

Тонечка ж была маленькая, бялявая і досыць павольная. Летам у светлым плашчыку і капялюшыку, зімой у паліто і бурках на... абцасах (невядома дзе і калі набытых), яна досыць часта хадзіла ў касцёл. Замуж не выходзіла, гаспадаркі, можна сказаць, не мела, падчас працы ў паляводстве заўжды была апошняй, бо не магла не заслухацца спевамі якой-небудзь птушачкі, не магла не палюбавацца аблокамі.

А яшчэ яна смешна размаўляла. Ну вось паслухайце. Раніца. Зіна носіцца па дварышчы то з вёдрамі са свіной мяшанкай, то з зернем для курэй, то з травой для трусоў.

Прыходзіць Тонечка, топчацца ля ганка, кожны Зінін «вылет» з хаты сустракае пытаннямі пра надвор'е, здароўе, віды на ўраджай, а ўрэшце кіруе да весніц.

— Тоня, ты ж нечага прыходзіла? — услед ёй крычыць Зінаіда.

— Не жнаю, Жыначка, як табе і шкажаць...

— Коратка... Часу няма! — гарачыцца тая.

— Ваш шабачка шарваўся, жадушыў маю курачку і панёш жа ў вашу пуньку.

— Чэсік! — гукае Зіна свайго чалавека. — Злаві ў куратніку шэрую курыцу, аддай Тоні. І сабаку зранку не кармі — ён не галодны.

Усё, інцыдэнту як не было.

...Альбо вось яшчэ. Сядзяць Зіна з Тонечкай поруч на вясковай бясэдзе. Сярод звыклых страў — невялічкія лустачкі батона з маслам і парачкай шпроцін.

Тонечка бярэ адзін бутэрброд, хуценька з'ядае шпроты, таўхае ў бок суседку:

— Ж'еш, Жыначка, гэты батончык — шмачны, швежанькі.

Зінаіда ўздыхае, наверх на батон кладзе кавалак дамашняга сыру і есць, бо што тут зробіш: Тонечка ў нас за паненку.

Гэта Зіна, устаўшы на досвітку, агледзела гаспадарку, да дванаццаці палола калгасныя буракі, потым з цяжкай паштовай сумкай аблётала тры вёскі; вярнуўшыся дамоў, намыла бялізны, сцягала ў пуню (праўда, Чэсік памог) два вялікія вазы сена, падаіла карову — стаіць, працэджвае малако.

Прыходзіць Тонечка з букецікам незабудак, садзіцца на канапе, са светлай усмешкай пытае:

— Жыначка, ты што болей любіш — лета ці жыму?

— Ці доўга ты думала, каб дурное згарадзіць? — злуецца стомленая працай суседка. — Ну, вядома ж, зіму!

Тонечка нюхае кветкі:

— А я вось — лета: шонейка шведзіць, птушачкі пяюць, кветачкі цвітуць...

— Цьфу ты! — выходзячы з сябе, ляпае дзвярыма Зіна.

Тонечка, у якой з усіх летніх работ толькі зрэзаць засохлыя кветкі півоняў ды прапалоць граду з цыбуляй, разгублена ліпае вачыма: яна шчыра не разумее, як можна не любіць лета?

**А. Навасельская,**
*Мінскі раён.*

## БЯСПРОЙГРЫШНЫ ВАРЫЯНТ

...Перафразую класіка: піць ці не піць, вось у чым пытанне!

Зрэшты, асобныя з людзей ніколі не вагаюцца. Яны, калі хочуць (а хочуць амаль заўсёды), знойдуць і вып'юць. Прычым, як спяваў незабыўны Высоцкі, «выпьют обязательно»... І, на жаль, ці не ўсё, што гарыць.

Шмат народу праз гэта палегла, ды што змянілася? Усё роўна ж п'юць. Многія нешта зрабіць падраджаюцца — просяць «перадаплату». Як толькі атрымаюць, ім тут жа адлучыцца трэба, на пяць хвілін, не болей... Каб потым — знікнуць назаўжды, з канцамі, з той самай «перадаплатай».

Вам пашчасціла? «Работнік» застаўся? Тады ў «працэсе» можа папрасіць цыгарэт купіць альбо чарку наліць, а разлічыцца потым — па поўнай, «як дамаўляліся».

Шмат хто з п'яніц просіць грошай у доўг. Аднаму неяк рубля не хапала да поўнага шчасця: ну вельмі прасіў! Казаў, што 16-га ў яго зарплата, бажыўся, што, вядома ж, аддасць!..

Я толькі потым сцяміла, што сёння ж 18-га... І што ён увогуле не працуе.

Затое цяпер заўсёды вітаецца, пытае ў мяне, як здароўечка? Падобна, турбуецца? Хоча, каб даўжэй пажыла ды яшчэ калі грошай пазычыла.

...Ёсць, праўда, і тыя, што апрыёры нават не думаюць ні падзарабляць, ні пазычаць. Яны каля крам тусяць ці стаяць як на паперці, просяць: «Ну падайце...» То ім рубля, то хоць 40 капеек... Жабруюць, бедныя.

А вось некалі — мне здаецца — нават п'яніцы іншыя былі: прынамсі, не жабравалі, чужых людзей не падманвалі... Але ж выпіўку, знаходзілі — як тыя «дзюдзі» гразь... Жонкі ды матулі іх чаго ні рабілі, каб неяк стрымаць, каб адвучыць ад гарэлкі. Хавалі спіртное, хоць гэта і марная справа, бо тыя ўсё роўна знаходзілі, нават... пад зямлёй.

Адзін піток расказваў, што неяк абшнарыў усе куточкі — і ў хаце, і ў склепе, і ў лазні, і ў хлявах, па агародзе з рыдлёўкай прайшоўся...

У садзе заўважыў, што зямля ў адным месцы вільготная. Прыгледзеўся — дзёран падкапаны. Пласт адвярнуў і... свята (!). Пад ім тры слоікі стаяць.

Добра, што дома нікога не было: з аднаго колькі трэба адліў, дзёран — з усёй акуратнасцю — на месца палажыў, зямельку прыбраў.

І вось так — штодня. Жонка, бедная, даўмецца не магла, як так? Хованка не парушана, а гаспадар «пад мухай».

Тыдні праз тры заўважыла, што дзёран як бы «прагнуўся». А падняла яго і там жа села: два трохлітровікі зусім пустыя, у трэцім — хіба шклянка на дне.

Во ўжо крыку было:

— Пад зямлёй знайшоў! Дзевяць літраў выжлукціў!.. Я ж на вяселле гнала. Дзірваном закрыла... Каб цябе ўжо самога...

З хаты выгнала як сабаку, у ганку спаў.

Раніцай прачнуўся ад таго, што суседка міма прайшла. У кухні з жонкай сядзяць і лады ладзяць. Мая — чую — плача, пра сваю бяду расказвае, успамінае, чаго толькі ні рабіла, каб адвадзіць мяне ад гарэлкі! Яно і праўда — прасіла, разводам палохала, нейкія зёлкі давала, плаціла наркологам...

— Тут іншы сродак патрэбен, больш радыкальны, — бубніць суседка (я за сценкай вушы наваструў). — Бабы на базары казалі, што трэба мышэй налавіць, на гарэлцы ў цёмным месцы настаяць і падсунуць, каб выпіў...

Мяне спрасонку смага душыла — жах, як вады хацелася! А тут... Дзе што ўзялося?! Аж кішкі вон... Куляй за вугал выскачыў!

Стаю там, ледзь дыхаю, а бабы ж далей гамоняць.

— Ну давай паспрабуем... Мышэй я на сябе вазьму, — абяцае суседка. — У мяне ж і пастка ёсць.

Жонка — чую — носам хлюпае, але маўчыць. «Няўжо, думаю, пагодзіцца?! Ведае ж, што мне паўваласка на талерцы, і я ўжо есці не буду... А тут...

— Не, — мая Ніна кажа (у мяне і камень з душы). — Ён хоць п'яніца, але ж чалавек яшчэ, муж. Я з ім 30 гадоў пражыла, дзяцей выгадавала. Не магу яго так пакрыўдзіць!

...Вось і я яе болей не магу: трэці месяц не п'ю. Не буду падманваць: нейкай белай гарэлкі спачатку жах як хацелася, а вось на нешта іншае — ды яшчэ і каляровае (!!!) — нават глядзець не магу!.. Суседка праўду сказала: бяспройгрышны варыянт.

...Можа, ён яшчэ камусьці прыдасца?

**С. Вароніна,**
*Быхаўскі раён.*




**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# МОЙ ЖУРФАК

## Ён сам па сабе — асоба...

НА факультэце журналістыкі БДУ сёння свята — урачыстае мерапрыемства з нагоды 80-гадовага юбілею. І настрой у мяне асабіста з гэтай нагоды ўзнёсла-ўрачысты, нібы святкуе шаноўны юбілей — прычым у добрым здароўі і на сваіх нагах — хтосьці з тваіх родзічаў ці знаёмых, каму ты абавязаны чымсьці вельмі важным у жыцці. Хтосьці, думаю, тут усміхнецца скептычна: маўляў, так кожны чалавек з вышэйшай адукацыяй можа сказаць пра сваю альма-матар, але ж адушаўляць факультэт, параўноўваючы яго з блізкім чалавекам, — гэта ўжо занадта. Магчыма, яно і так, калі гэта не пра журфак. Журфак жа сам па сабе нават не жывы арганізм, а асоба, са сваімі характарам, звычкамі, якасцямі, душой, калі хочаце. І пісаць пра яго — якім ён запомніўся табе за пяць гадоў, што вы правялі разам, — трэба менавіта як пра суб'ект адушаўлёны.

ЖУРФАК — вялікі скептык, нават цынік. Ён вельмі хутка збівае карону, якая вырастае на галаве ледзь не кожнага першакурсніка — на факультэт жа ўсе паступаюць у статусе калі не генія, дык вялікага таленту. Журфак ветліва, з лёгкай крыху здзеклівай усмешкай ужо тыдні праз два дае зразумець, што ніякі ты не геній. Талент? Магчыма. Але, каб штосьці атрымалася, яшчэ многае і многае трэба зрабіць. «Пачні з напісання заметкі», — прапануе журфак. «Ды лёгка», — фыркае першакурснік. А праз нейкі час разумее, што зусім усё нялёгка, гэта не школьнае сачыненне на пяць старонак пісаць. «Ну вось, бачыш, — гаворыць журфак. — Здымай карону, садзіся, будзем вучыцца. Пачнём з інфармацыйных жанраў...»

ЖУРФАК — вялікі выдумшчык. На якім яшчэ факультэце студэнтам на занняткі могуць прынесці бохан хлеба і прапанаваць напісаць пра яго замалёўку ці нарыс — і гэта будзе абсалютна нармальна. Ці, напрыклад, выкладчык заходзіць у аўдыторыю і дае заданне — напісаць пра мітынг, які праходзіць побач на плошчы (гэта згадка з маіх журфакаўскіх 90-х, калі тыя мітынгі былі па два на дзень). І вось уявіце карціну: стаяць тыя дваццаць чалавек мітынгуючых, пад'язджае тралейбус, з якога вывальвае трыццаць чалавек другакурснікаў-«газетчыкаў» і літаральна кідаецца да тых нешматлікіх небарак з пытаннем: а чаго вы тут стаіце? Весела, займальна. Хто яшчэ можа пахваліцца такімі практычнымі заняткамі?

ЖУРФАК — вялікі філосаф. Ён вучыць думаць, аналізаваць, шукаць карані і першакрыніцы. Напэўна, толькі на журфаку на экзамене па літаратуры можна выцягнуць... пусты білет. І прыдумаць сабе пытанні, і на іх жа адказваць. Ці, як аўтарцы гэтых радкоў, маглі прапанаваць увогуле білет не цягнуць, а раскрыць тэму «Кацярыны ў рускай літаратуры XIX стагоддзя». Што з таго, што гэтага не было ў экзаменацыйных пытаннях і што на падрыхтоўку — стандартныя дзесяць-пятнаццаць хвілін? Думай, успамінай, імправізуй — у жыцці, у прафесіі гэта не раз прыйдзецца рабіць... Напэўна, толькі на журфаку на практычных занятках па філасофіі ладзілася дуэль паміж прыхільнікамі Ніцшэ і Фрома (некаторыя перад семінарам упершыню прачыталі штосьці з гэтых выбітных таварышаў, але калі запісалі цябе ў прыхільнікі — станавіся ім, адстойвай сваю думку)... З журфака мы выносім не выслоўе вядомага філосафа, а ўжо ўсвядомленае разуменне: сапраўдны інтэлігент — гэта той, хто паважае ўсіх без выключэння людзей, не зважаючы на ўзровень дабрабыту і сацыяльны статус. І менавіта гэта разуменне вельмі дапамагае пасля ў працы...

ЖУРФАК — вялікі інтэлектуал. Ён не толькі раней за многіх іншых падхоплівае ўсё новае — ён беражліва захоўвае і перадае веды і напрацоўкі папярэдніх пакаленняў у розных гуманітарных сферах. Гэта таксама пасля вельмі дапамагае ў прафесіі: ты можаш на прыстойным узроўні падтрымаць дыскусію аб імпрэсіянізме ў музыцы ці неарэалізме ў італьянскім пасляваенным кіно, ты ведаеш, як звяртацца да чалавека, каб ён цябе пачуў і зразумеў, ты нядрэнна валодаеш ведамі па гісторыі, ты шмат-шмат прачытаў — інакш бы ты проста не давучыўся — літаратурных твораў: замежных, рускіх, беларускіх. І пішаш ты без памылак (ці амаль), і думкі фармулюеш больш-менш складна. Хоць журфак шчыра папярэджвае: пісаць (у сэнсе быць журналістам) цябе не навучаць. «Калі ёсць «клёпка» ў галаве — падкруцім, падправім, калі няма — ніхто вам яе ў галаву не ўставіць». Гэтыя словы, пачутыя на журфаку ад паважанага прафесара, пачынаеш цалкам разумець і прымаць, толькі калі прыходзіш у прафесію.

ЖУРФАК — вялікі наватар і адначасова вялікі кансерватар. Ён падтрымлівае новыя думкі, ідэі, падачу, ён нават заахвочвае да пошуку і ўкаранення новага. Але ён захоўвае і ахоўвае традыцыі і памяць, не адмаўляецца ад таго, што пакінулі, напрацавалі папярэднія студэнты і выкладчыкі. Пачынаючы ад тых першых, якія ўвосень 1944 года прыйшлі ў разбураным Мінску вучыцца на журналістаў і якія сталі пасля аўтарамі падручнікаў, выкладчыкамі, настаўнікамі для некалькіх пакаленняў журфакаўцаў. Дзякуючы якім у журфака з'явілася душа, якія вучылі нас быць не толькі прафесіяналамі — найперш людзьмі...

ВОСЬ такім бачыцца сённяшні юбіляр амаль праз трыццаць гадоў пасля таго, як мы з ім развіталіся. Зрэшты, развітанне тое было толькі намінальным. Бо — ледзь не забылася вельмі важнае — менавіта на журфаку да студэнтаў з першага іх дня звяртаюцца: «калегі»...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## Организатор торгов (ликвидатор совместного общества с ограниченной ответственностью «Петрофф Плюс») объявляет о проведении повторных торгов по продаже имущества в форме аукциона

| | |
|---|---|
| **Продавец** | Совместное общество с ограниченной ответственностью «Петрофф Плюс» |
| **Место проведения торгов** | г. Минск, ул. Лещинского, дом 12, комн. 9 |
| **Дата и время проведения торгов** | **11.12.2024 г. в 12.00** |
| **Срок подачи заявок** | Не позднее 06.12.2024 г. до 17.00 |
| **Ранее опубликованные извещения о проведении торгов** | Газета «Звязда» от 02.12.2023 г. № 234 (300964), от 14.02.2024 г. № 31 (30165), от 13.04.2024 г. № 74 (30208), от 18.09.2024 г. № 182 (30316) |

**Предмет торгов и начальная цена**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота, руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 500/С-43932, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12, общей площадью 1204,5 кв. м; наименование: главный корпус станции технического обслуживания, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды | 3 100 000 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 500/С-43933, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12/1, общей площадью 721,9 кв. м; наименование: помещение мойки, кафе, административные помещения, назначение: здание многофункциональное, расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды | 1 700 000 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 500/С-43836, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12/2, общей площадью 538,4 кв. м; наименование: вспомогательный корпус станции технического обслуживания, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды | 1 160 000 |

| | |
|---|---|
| **Обременения** | В отношении всех лотов – ипотека, аренда |
| **Порядок подачи заявок** | Заявления на участие в торгах с приложением платежных документов, подтверждающих внесение задатка, принимаются по месту проведения торгов либо направляются по адресу: 220052, г. Минск, а\я 17 (получатель – ликвидатор СООО «Петрофф Плюс» ИП Ржеутский А. В.), со дня выхода настоящего извещения |
| **Задаток** | Задаток в размере десяти процентов от начальной цены лота перечисляется на р/с BY90 PJCB 3012 0763 3310 0000 0933 в «Приорбанк» ОАО, г. Минск, БИК PJCBBY2X, получатель – СООО «Петрофф Плюс»», УНП 190861019 |
| **Условия аукциона** | Шаг аукциона: пять процентов. При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, и он согласен приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов, также победитель аукциона – претендент на покупку должен заключить с продавцом договор купли-продажи в течении двух рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.<br>Оплата стоимости предмета торгов осуществляется в течение пяти банковских дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не определено договором купли-продажи. Возмещение затрат, связанных с организацией и проведением торгов осуществляется участником, выигравшим торги, в течение пяти банковских дней со дня проведения торгов.<br>Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты их проведения.<br>Порядок проведения аукциона установлен Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 г. № 16 |

**С дополнительной информацией можно ознакомится по тел. +375 (29) 667 16 72**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ЗА ОДНУ БАЗОВУЮ ВЕЛИЧИНУ

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

**Продавец:** ОАО «Витебскоблавтотранс», 210601, г. Витебск, ул. С. Панковой, 1, тел.: +375 (212) 22-80-44, +375 (2132) 6-19-07.

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 236/С-14256, общей площадью 479,0 кв. м; наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное, по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г.п. Бегомль, ул. Черныша, 39, на зем. участке с кадастровым № 222155200001000842, площадью 1,1032 га, по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Черныша, 39 (право постоянного пользования). Целевое назначение зем. участка – для размещения объектов административного назначения.

**Нач. цена:** 1 базовая величина (40,00 рублей).

**Задаток:** 1 базовая величина (40,00 рублей).

**Лот № 2.** Кап. строение с инв. № 225/С-13397, общей площадью 676,0 кв. м; наименование – гараж на 16 мест, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Черныша, 39, на зем. участке с кадастровым № 222180290410000068, площадью 0,1182 га, по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Черныша, 39 (право постоянного пользования). Целевое назначение зем. участка – для обслуживания гаража на 16 машино-мест.

**Нач. цена:** 1 базовая величина (40,00 рублей).

**Задаток:** 1 базовая величина (40,00 рублей).

**Дата, время и место проведения аукциона: 20.12.2024 г. в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в здании ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 02.12.2024 г. с 08.30 по 19.12.2024 г. до 17.30. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901.**

**Условия аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по нач. цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, подписать договор купли-продажи в течение 11 рабочих дней с даты утверждения протокола аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, определенные условиями договора купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета аукциона. **Аукцион проводится в порядке, установленном Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 05.05.2009 г. «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» и Положением «О порядке организации и проведении торгов по реализации имущества ОАО «Витебскоблавтотранс» от 23.05.2024 г.**

Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, расходах на проведение независимой оценки письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона.

**Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**

**Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (29) 7121271.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **2024.Ч.002.00136** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** ОАО «Витебскоблавтотранс», 210601, г. Витебск, ул. С. Панковой, 1, тел.: +375 (212) 22-80-44, +375 (2132) 6-19-07.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 19.12.2024 г. в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 230/С-11645, общей площадью 713,8 кв. м; наименование – здание котельной, назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, расположенное по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Витебская, на земельном участке с кадастровым № 222750100001001557, площадью 0,6655 га по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Витебская (право постоянного пользования, доля 1/1). Целевое назначение зем. участка – зем. участок для использования под котельную.

**Нач. цена:** 40,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 40,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга»: etpvit.by.

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами:** до 16.00 18.12.2024 г.

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения эл. торгов и утверждения протокола эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить расходы Продавца на проведение независимой оценки, оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи в течение 11 рабочих дней с даты утверждения протокола эл.торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядке и сроки, определенные условиями договора купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета эл. торгов.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения.

Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом **по тел.: +375 (29) 712-12-71.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Организатор: **Государственное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска»,** 220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, тел. +375 (17) 3600685

Торги проводятся **30.12.2024 г.** ЭТП «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**

**Право заключение договора аренды на изолированное помещение**
(инв. № 500/D-70788817),

расположенное по адресу: г. Минск, ул. Алеся Гаруна, д. 26, пом. 1Н.

Окончание приема заявлений – 24.12.2024 г. до 15.00.

Подробная информация на сайте **www.et.butb.by.**

УНП 192605364

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1783 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-610835, площадь – 217,9 кв. м, назначение – квартира, наименование – квартира. В состав объекта входит: котел газовый VAILLIANT VK INT 35/K-1E, газовый проточный водонагреватель Ariston Superlux DGI 10LCF, кондиционер LG S09LHP, кондиционер Tadilux TRM 12, кондиционер Tadilux TRM 12, козырек.<br>Кондиционер Toshiba (инв. 20084-1); кондиционер KB 2-2.20 Энергия (инв. 20083); кондиционер DAIKIN (внутренний FTXF35C + наружный RXF35C – блоки сплит-системы) (инв. 70041017); кондиционер LG (инв. 00005427); система контроля доступа (инв. 70280); слаботочная линии связи в адм. пом. ГО (инв. 48013002); система вентиляционная (инв. 41602018); система пожарной сигнализации (инв. 50426205); ограждение с полимерным покрытием; счетчик холодной воды ETK-м-N с электронным модулем сбора данных PDC LR – (инв. 47063001) | 1 111 531,90 | 11 115,32 | 55 576,60 |
| 1784 | Конференц-стол (инв. 10007) | 1 200,00 | 120,00 | 60,00 |

В отношении лотов проводятся первые торги

**Местонахождение лотов: г. Минск, ул. Достоевского, 27-1.**
Лот 1783 расположен на земельном участке с кадастровым номером 500000000008000483, площадь 0,0360 га, назначение – строительство и обслуживание жилого дома.
Право собственности (залог права ОАО «Приорбанк»)

Помещение и земельный участок под ним имеет обременение в виде залога ОАО «Приорбанк». В случае продажи объекта на торгах залог прекращается в силу законодательства (ст. 15 Закона Республики Беларусь от 20.06.2008 г. № 345-З (ред. от 28.06.2022 г.) «Об ипотеке»).
Объект используется не по назначению на основании решения администрации Советского района г. Минска № 1058 от 22.10.2013 г. «О согласовании использования не по назначению квартиры в жилом доме»

Продаваемое помещение является частью блокированного двухэтажного здания, имеет отдельный подъезд, собственный земельный участок площадью 0,036 га. **Помещение пригодно к административному использованию, для этого соблюдены все технические требования. Необходимые для обслуживания помещения инженерные коммуникации подведены и исправны.** Имеется центральная канализация. Согласно актуальному генплану здание под снос не подпадает

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **30 декабря 2024 года в 11.30 (регистрация с 11.00 до 11.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 29 ноября 2024 года до 15.00 27 декабря 2024 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ООО «Профитсистем», проводимых 30.12.2024 г.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста: по лоту № 1783 – 1,5 %, по лоту № 1784 – 9 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов осуществляется согласно договору купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375 (29) 3718060 Сергей**.
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 г. № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Профитсистем», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (17) 3958917 (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |




Надвор'е

# НА СТАРЦЕ СНЕЖНЯ БУДЗЕ ЦЯПЛЕЙ, ЧЫМ ЗВЫЧАЙНА

## А ў пачатку наступнага тыдня дождж і мокры снег

**Пра гэта паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу надвор'е ў Беларусі ў асноўным будуць вызначаць франтальныя раздзелы ад актыўнага цыклону, толькі днём на захадзе адаб'ецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Чакаецца перавага воблачнага надвор'я. Ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі, днём пераважна па ўсходняй частцы краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Месцамі прагназуюцца туман, слабы галалёд і наліпанне мокрага снегу. На асобных участках дарог галалёдзіца.

Вецер няўстойлівы, ад слабага да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла. Тэмпература днём складзе ад мінус 1 градуса па паўночным усходзе да 7 цяпла па паўднёвым захадзе Беларусі. Атмасферны ціск будзе інтэнсіўна расці.

У апошні дзень лістапада ўладу над надвор'ем у асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі ноччу па паўднёвым усходзе краіны адаб'ецца ўплыў няўстойлівых паветраных мас. Воблачна з праясненнямі. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, а максімальная днём — ад нуля да 6 цяпла.

У першы дзень зімы захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Воблачна з праясненнямі. Пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы ад 4 марозу да 1 цяпла. Па поўдні краіны пры праясненнях паветра астудзіцца да мінус 7 градусаў. Днём тэмпература паветра 0—6 градусаў вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак таксама пераважна ападкаў не прагназуецца. У асобных раёнах можа быць слабы туман, ноччу і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, пры праясненнях да мінус 6 градусаў. Максімальная тэмпература днём — ад нуля да плюс 6 градусаў.

Вымачымся мы выключна ў аўторак. У гэтыя суткі ноччу пераважна будзе без ападкаў, раніцай і днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу. У асобных раёнах прагназуецца слабы туман, ноччу і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла, пры праясненнях па паўднёвым усходзе краіны да мінус 7 градусаў. Максімальная тэмпература днём будзе ад нуля да плюс 5 градусаў.

У сераду невялікі мароз чакаецца нават днём. У гэты дзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ўжо будзе апускацца да мінус 5 градусаў, але днём усталюецца ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.02 | 16.53 | 7.51 |
| Віцебск — | 8.58 | 16.37 | 7.39 |
| Магілёў — | 8.52 | 16.43 | 7.51 |
| Гомель — | 8.41 | 16.48 | 8.07 |
| Гродна — | 9.16 | 17.10 | 7.54 |
| Брэст — | 9.09 | 17.18 | 8.09 |

## Месяц

*Апошняя квадра 23 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

## Імяніны

**Пр.** *Васіля. Віктара, Івана, Мацвея, Мікалая, Міхаіла, Сцяпана, Фёдара.*
**К.** *Дар'і, Маргарыты, Блажэя, Сатурніна, Сцяпана, Фрэдэрыка.*



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# ЗАЎТРА




# 29 ЛІСТАПАДА — Даты. Падзеі. Людзі

У краіне

**1812** год — скончылася бітва на рацэ Бярэзіне. Яна адбылася паміж французскімі карпусамі і расійскімі арміямі Чычагава і Вітгенштэйна на абодвух берагах Бярэзіны пры спробе пераправы Напалеона падчас вайны 1812 года.



**1830** год — пачалося так званае Лістападаўскае паўстанне (1830—1831). Яго мэтай было аднаўленне дзяржаўнасці Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у межах 1772 года.

**1859** год — нарадзіўся Мікалай Андрэевіч Янчук, беларускі, украінскі і расійскі вучоны-славіст, пісьменнік. Скончыў Маскоўскі ўніверсітэт. Адзін з заснавальнікаў часопіса «Этнографическое обозрение», дзе друкавалася шмат беларускіх матэрыялаў. З 1918 года чытаў курс беларускай і ўкраінскай літаратуры ў Маскоўскім універсітэце, удзельнічаў у рабоце камісіі па арганізацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1921 годзе — прафесар кафедры беларускай літаратуры і этнаграфіі БДУ. Першым пачаў на навуковай аснове збіраць і вывучаць беларускі музычны фальклор, даў аб'ектыўную эстэтычную ацэнку беларускаму песеннаму меласу. Аўтар шматлікіх прац у галіне антрапалогіі і археалогіі (у тым ліку «Некаторыя даныя да пытання аб антрапалагічным тыпе беларусаў»), літаратуразнаўстве, мастацкім перакладзе; апрацовак народных песень, у тым ліку беларускіх арыгінальных музычных твораў.

**1924** год — у Мінску адбылася Першая Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя. Прысутнічала каля 40 дэлегатаў ад Цэнтральнага бюро краязнаўства, краязнаўчых і грамадскіх арганізацый. Даклады і выступленні былі прысвечаны дасягненням беларускіх краязнаўцаў, папулярызацыі вынікаў даследаванняў, стварэнню краязнаўчых музеяў, пошуку і вывучэнню археалагічных і іншых аб'ектаў.

У свеце

**1789** год — нарадзіўся Аляксандр Брулоў, расійскі архітэктар, мастак, прафесар архітэктуры Імператарскай Акадэміі мастацтваў.

**1802** год — нарадзіўся Вільгельм Гауф, нямецкі пісьменнік і навеліст, прадстаўнік кірунку «бідэрмаер» у літаратуры. Літаратурная спадчына Гаўфа складае тры альманахі казак, адзін з якіх быў выдадзены яго жонкай пасля смерці пісьменніка, некалькі раманаў і вершаў. У Баерсброне знаходзіцца «Музей казак Вільгельма Гаўфа». У 1977 годзе тыражом у 300 000 асобнікаў на беларускай мове была выдадзена казка «Маленькі Мук», якую з нямецкай пераклаў Даір Слаўковіч.

**1877** год — амерыканскі вынаходнік і бізнесмен Томас Эдысан упершыню прадэманстраваў грамафон. Асноўная перавага грамафона над фанографам — папяровы запіс, які забяспечвае зніжэнне скажэнняў у дзясяткі разоў, а таксама больш гучны гук (ужо ў першых мадэлях — у 16 разоў, або на 24 дб). Разам з лёгкасцю тыражавання запісаў гэта забяспечыла хуткую перамогу грамафона над яго папярэднікам.



Так гаварыў...

**ЭМІЛЬ КРОТКІ:**

*«Падхалім іншы раз падобны альпіністу: ідзе ў гару».*

# УСМІХНЕМСЯ

**Я вельмі люблю парадак, таму заўсёды стаўлю кубак кавы на каваvы след ад папярэдняга кубка.**

— Афіцыянт! Я ўжо дзве гадзіны чакаю квашаніну!

— Усё-ўсё, паставілі варыць!

**Офіс. Аддзел кадраў. Суіскальнік на пасаду і кіраўнік аддзела кадраў.**

**Кіраўнік:**

**— Вы ведаеце, у першую чаргу ў нас на прадпрыемстве цэніцца акхайнасць. Вось вы, калі заходзілі, ногі аб палавічок выцерлі?**

**Суіскальнік:**

**— Так, вядома, перш за ўсё.**

**Кіраўнік:**

**— У другую чаргу ў нас цэніцца чэснасць. Ніякага палавічка там няма.**



— Хто такая жанчына-пярэваранцэнь?

— Тая, якая ўвесь дзень пілуе мужа, нібы піла, а ўначы ператвараецца ў бервяно.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 855. Індэкс 63850. Зак. № 2620.

Нумар падпісаны ў 19.30 28 лістапада 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12